№ 46 (692) 8 снежня 2010

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**ЗША падтрымліваюць будаўніцтва АЭС у Беларусі**

Старонка 2



**Дэфіцыт валёнак**

Старонка 4



**Чаму гараць аўтамабілі**

Старонка 15

## У НУМАРЫ

**Украінская кампанія правядзе экзіт-пол у Беларусі**
Але на замову лукашэнкаўскага АНТ. **Старонка 5.**

**Хто лаяўся матам падчас тэледэбатаў?**
Брыдкі выраз добра чуваць «за кадрам». **Старонка 8.**

**Мама Раманчука: «Гарантую, што ўлада не сапсуе Ярыка»**
Рэпартаж з роднай хаты кандыдата ў прэзідэнты. **Старонка 9.**

**Ірына Халіп:** Атрымала задавальненне ад выступаў кандыдатаў у прэзідэнты. **Дзяніс Мельянцоў:** Вы гэта сур'ёзна, хлопцы-дзеўкі? Палеміка. **Старонка 7.**

**Затрымалі банду з Пскова**
Яны абрабавалі кватэру ў Мінску і напалі на ўладальніка BMW X5 у Полацку. **Старонка 2.**

**У навеле Караткевіча цэнзар зрабіў 296 правак**
Выйшла «Ладдзя Роспачы» ў арыгінальным выглядзе аўтарскага рукапісу. **Старонка 13.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі старонку 2.

# Вернай дарогай

Дэлегаты IV Усебеларускага народнага хурала выказалі адзінадушную падтрымку мудрай палітыкі Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.




«Сёння ў Мінску праходзіць IV усебеларускі сход — адзін з найважнейшых форумаў у жыцці краіны», — гучала 6 і 7 снежня з дынамікаў у мінскім грамадскім транспарце. Цэнтральныя вуліцы раз-пораз перакрываліся, каб прапусціць аўтобусы з дэлегатамі. Дзяржаўныя тэлеканалы транслявалі карцінку, здалёк малаадрозную ад XXVII з'езда КПСС.

«Беларускі народ ставіць перад сабой грандыёзныя мэты», — перадавалі ў панядзелак дзяржаўныя СМІ словы касманаўта Пятра Клімука, таксама дэлегата.

Агулам, каб абмеркаваць «актуальныя тэмы, што датычаць кожнага чалавека», у Палац Рэспублікі з'ехаліся больш за 2500 чалавек.

**Працяг на старонцы 3.**

### Пагоня за лічбамі коштам велізарнага доўгу

Прайшоў чарговы усебеларускі сход. А што выканана з праграмы, прынятай на папярэднім хурале? «Наша Ніва» падлічыла. **Старонка 4.**

## Падарункі дэлегатам хурала пацягнулі на $575 тысяч

Народным абраннікам дарылі мікрахвалёўкі, гадзіннікі і аксесуары.

Усё, апроч нуднага шматгадзіннага сядзення ў зале Палаца Рэспублікі, цікава — і экскурсія па сталіцы, і канцэрт зорак эстрады. Але галоўнае — карысныя падарункі. Удзельнікі папярэдніх хуралаў атрымлівалі на дурніцу гарызонтаўскія тэлевізары. Што ў сёлетнім меню падарункаў?

Таямніцу адкрыў дэпутат Мінгарсавета, камуніст Юрый Васкрасенскі. У сваім інтэрнэт-блогу ён пералічыў прадметы з падарункавага набору. Карэспандэнт «НН» прайшоўся па крамах і перапісаў цэны на такія ж ці аналагічныя тавары, каб даведацца, колькі каштуе краіне кожны дэлегат хурала.

**Працяг на старонцы 5.**

**Аўтастопам ад Нью-Ёрка да мыса Горн**




Захапляльныя падарожныя дзённікі Аўгіні Манцэвіч. **Старонка 10.**

## Віцебская справа — 2

З падлеткаў, падазраваных па справе аб гучным забойстве ў Віцебску, выбівалі паказанні.

Магілёўскі абласны суд 29 лістапада прызнаў невінаватымі двух непаўналетніх віцяблянаў — Аляксандра Логінава і Аляксандра Напаюка. Іх вінавацілі ў забойстве, здзейсненым з асаблівай жорсткасцю групай асоб (па пп. 6; 15, ч.ІІ, арт. 139 КК РБ), у чэрвені 2009 года ў Віцебску. Пасля абвяшчэння прысуду абвінавачаныя былі вызваленыя з-пад варты ў зале судовага пасяджэння. За кратамі яны правялі амаль паўтара года.

Зверскае забойства (пацярпелы памёр ад 63-х нажавых раненняў і шматлікіх удараў) 31-гадовага беспрацоўнага адбылося 14 чэрвеня 2009 г. недалёка ад абласной бальніцы ў Віцебску.

У аператыўнікаў Першамайскага РАУС зачэпак не было, затое на носе быў чарговы «Славянскі базар». А чуткі пра крывавае злачынства ўжо распаўзліся па абласным цэнтры. Супакоіць народ можна было гучнай заявай аб затрыманні злачынца. І тут пад руку мясцовым Шэрлакам трапіліся тры дзевяцікласнікі віцебскай гімназіі № 7 — Логінаў, Напаюк і Аўчароў. Яны прыйшлі на наступны дзень пасля забойства (яшчэ не ведалі пра злачынства) на тое самае месца ля пажарнага вадаёма адзначыць сканчэнне навучальнага года.

**Працяг на старонцы 6.**

# ЗША падтрымліваюць будаўніцтва АЭС у Беларусі

1—2 снежня ў казахскай Астане прайшоў саміт краін-удзельніц АБСЕ. Апошні раз такое мерапрыемства адбывалася адзінаццаць гадоў таму ў Стамбуле. Тады Аляксандр Лукашэнка не мінуў магчымасці паручацца і сфатаграфавацца з тагачасным прэзідэнтам ЗША Білам Клінтанам. Сёлетні саміт таксама быў цікавы актывізацыяй беларуска-амерыканскіх дачыненняў.

Дагэтуль пацяпленне паміж Мінскам і Вашынгтонам не назіралася. Пасольствы па-ранейшаму працуюць у абсечаным рэжыме. ЗША не здымае санкцый з беларускіх прадпрыемстваў. Паездка кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Уладзіміра Макея ў Вашынгтон сарвалася.

### Сустрэча Клінтан і Мартынава

І тут раптам навіна: ЗША падтрымліваюць намаганні Беларусі па будаўніцтве АЭС. Пра гэта гаварылася ў супольнай заяве ЗША і Беларусі па выніках сустрэчы дзяржсакратара ЗША Хілары Клінтан і міністра замежных спраў Беларусі Сяргея Мартынава ў Астане.

Бакі абавязаліся «мацаваць глабальнае супрацоўніцтва ў сферы мірнага выкарыстання ядзернай энергіі ». Маецца на ўвазе менавіта «будаўніцтва першай АЭС грамадзянскага прызначэння» ў Беларусі. «ЗША падтрымліваюць намаганні Беларусі па хутчэйшай рэалізацыі гэтага камерцыйнага праекта», — адзначаецца ў сумеснай заяве. Адзначана, што праект мае прадугледжваць «канкурэнтны працэс праектавання і будаўніцтва надзейнай і бяспечнай станцыі».

### Хто пабудуе АЭС?

Падчас усебеларускага хурала Лукашэнка паведаміў, што разглядаюцца розныя варыянты. А нядаўна ж Расія была адзіным партнёрам. Як вядома, тэхналогіі будаўніцтва АЭС сёння маюць усяго некалькі краін, сярод іх ЗША. Амерыканская кампанія «Вестынгхаўс» узводзіць атамныя электрастанцыі ў хаўрусе з японскай «Тошыбай».

### Спыніць распрацоўку ўрану

Хілары Клінтан таксама назвала «гістарычным» рашэнне Беларусі аб адмове ад ядзернай зброі, прынятае ў 1994 годзе, і зноў пацвердзіла гарантыі бяспекі Беларусі, зафіксаваныя ў Будапешцкім мемарандуме ад 5 снежня 1994 года. «Міністр замежных спраў Беларусі аб’явіў аб тым, што Беларусь прыняла рашэнне аб ліквідацыі ўсіх сваіх запасаў высокаўзбагачанага ўрану і мае намер ажыццявіць гэта да наступнага саміту па ядзернай бяспецы ў 2012 годзе. Злучаныя Штаты маюць намер прадаставіць тэхнічную і фінансавую дапамогу для хуткага ажыццяўлення гэтых мер», — гаворыцца ў сумеснай заяве.

Невядома, ці ёсць у Беларусі той уран. Улады кажуць, што так, многія адмыслоўцы – што не. Але цяпер Беларусь адмовілася нават ад ідэі яго распрацоўкі і канчаткова пазбавіцца статусу ядзернай дзяржавы.

### «ЗША станоўча ацэньваюць...»

У апошніх пунктах заява пераходзіць ад пытанняў атама да палітыкі. ЗША станоўча ацанілі рашэнне Беларусі запрасіць значную колькасць міжнародных назіральнікаў на прэзідэнцкія выбары. «Для паляпшэння двухбаковых адносін першачарговую важнасць па-ранейшаму мае праява большай павагі да дэмакратыі і правоў чалавека», — гаворыцца ў заяве. ЗША спадзяюцца «ўбачыць істотны прагрэс» у датрыманні стандартаў дэмакратыі падчас выбараў.

Захад у чарговы раз акцэнтаваў, што датрыманне дэмакратычных нормаў дае краіне шырокія магчымасці. У тым ліку эканамічныя.

**Мікола Бугай, Зміцер Панкавец**

# Затрымалі банду з Пскова, што рабіла набегі на Беларусь

Яны абрабавалі кватэру ў Мінску і напалі на ўладальніка BMW X5 у Полацку.

Бралі бандзюкоў паасобку. Аднаго — **Аляксандра (першы справа)** — узялі ў Мінску, астатніх — аж у расійскіх Вялікіх Луках. «Брыгада» гастралявала на тэрыторыі абедзвюх краін. Паводле следства, у групу ўваходзілі чатыры чалавекі: 1973, 1981, 1985 і 1988 года нараджэння. Банда вызначалася пэўным крымінальным крэатывам: адно са злачынстваў у Расіі бандзюкі здзейснілі ў міліцэйскай форме.

Яны карысталася празрыстасцю беларуска-расійскай мяжы: нарабіўшы дзялоў у Расіі, пераязджалі ў Беларусь. Беларускую мяжу «пскоўскія» міналі па адным, захоўваючы канспірацыю.

Следчыя падазраюць чацвёрку ў датычнасці да некалькіх злачынстваў. У кастрычніку яны напалі на ўласніка BMW X5 у Полацку. Пад выглядам пакупнікоў селі ў салон аўто і паспрабавалі задушыць гаспадара. Але кіроўца вырваўся, а аўто не завялося. Бандыты ўцяклі. Праз некалькі тыдняў яны прыйшлі «здымаць кватэру» на мінскай вуліцы Куйбышава, напалі на гаспадыню, звязалі і збілі. Пасля абабралі іншую кватэру на той самай пляцоўцы.

Банду з Пскова падазраюць таксама ў двух нападах на прадаўцоў дарагіх аўто. 16 лістапада быў збіты ўладальнік «Мерсэдэс-Бэнц», аўто скралі. А 19 лістапада разам з уласным BMW X5 знік мінчук Андрэй Барысаў. Ён паехаў паказваць машыну патэнцыйным пакупнікам на пляцоўку да мінскага гіпермаркета «Мацярык». Сцэнар мог нагадваць полацкі...

Ва Упраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС кажуць, што з Расіі запыт на экстрадыцыю Аляксандра не паступаў. Ён спачатку адсядзіць за свае злачынствы ў Беларусі, а пасля яго перададуць расійскаму боку. Згодна з міжнароднымі пагадненнямі, краіна паходжання асобаў, што здзейснілі злачынства на тэрыторыі іншай дзяржавы, самастойна прымае рашэнне аб іх экстрадыцыі. Таму, відаць, гастралёры, якія паспелі з’ехаць з Беларусі, будуць адбываць пакаранне на радзіме. Але адказнасці не пазбегнуць: следчыя перададуць расійскім калегам матэрыялы справы, датычныя дзейнасці банды, а ўжо расійскі суд «налічыць» ім гадоў за беларускія справы.

**Сямён Печанко**






**Калі вам штосьці вядома па справе злачыннай групоўкі з Пскоўшчыны, тэлефануйце па нумарах: (017) 218-52-76; (017) 218-79-14; (029) 327-0021.**

## Сціісла

**• «Коммерсант»: цана на газ вырасце да 230 даляраў.** Паводле прагнозу «Газпрама», кошт расійскага газу для Беларусі ў першым квартале 2011 года вырасце на 17,3% — да 230 даляраў. У чацвёртым квартале 2010 г. Беларусь купляе газ у Расеі па 196 даляраў за тысячу кубаметраў». У такім выпадку цана газу можа параўнацца для Украіны і Беларусі.

**• Побач з Лідай пачалі будаваць завод гарачага цынкавання металаканструкцый.** Афіцыйна, з удзелам прэм’ера Сяргея Сідорскага, закладзены першы камень у фундамент будучага прадпрыемства. Завод мае размясціцца прыблізна за 350 метраў ад найбліжэйшай вёскі і за 850 метраў ад аднаго з мікрараёнаў Ліды. Пратэсты мясцовага насельніцтва (было сабрана звыш 3 тысяч подпісаў) супраць будоўлі вынікаў не далі.

**• У Мінску збанкрутавалі дзве аўташколы.** На мяжы банкруцтва яшчэ адна. Знізіўся попыт мінчукоў на гэтую паслугу. Па краіне недабор курсантаў у параўнанні з мінулым годам склаў каля 20%.

**• ЗША часова прыпынілі друк 100-доларавых купюраў новага ўзору.** Іх меркавалася запусціць у абарачэнне ў лютым 2011 года. Рашэнне прынятае з прычыны вялікай колькасці браку пры друку. Тым часам з-пад друкарскага станка выйшла ўжо больш за мільярд такіх купюр. Зараз усе яны пойдуць пад нож.

**• Маразы да мінус 24 і снегапады.** У чацвер 16 снежня надвор’е ў краіне будзе вызначаць моцны паўднёвы цыклон, які рухаецца зараз з боку Партугаліі. Чакаюцца актыўныя ападкі ў выглядзе снегу, на поўдні з дажджом, вецер да 15–18 м/с. Тэмпература паветра ўдзень — ад мінус 4 па паўночным захадзе да плюс 2 па паўднёвым усходзе. А пасля да нас завітае арктычнае паветра. У суботу ўначы 6–13. У нядзелю мінус 10–17, пры праясненнях уначы да 19–24 марозу.

**СМ**

## nn@nn.by

### Рамкі для Лукашэнкі

Я, будучы на пенсіі, працаваў у СШ№34 г.Віцебска рабочым па рамонце і абслугоўванні будынка школы.

Прыйшлі прадстаўнікі раёна, ім не спадабалася, што партрэты Лукашэнкі вісяць пад плёнкай, сказалі заключыць іх у рамкі да заўтрашняга дня. Мы, трое рабочых, працавалі да дзевяці гадзін вечара. У школе няма шкла, фанеры, на рамкі няма багета, мы пілавалі тупой фрэзой на дрэваапрацоўчым станку, з падвала ішоў дым у класы.

Памятаю, Лукашэнка сказаў: «Настаўнік — гэта нітачка, каторая звязвае мяне з народам». Вось гэтыя нітачкі (настаўніцы) — ногі ў рукі і бягом у краму, купляць за свае грошы каляровыя фота Лукашэнкі. Рамкі мы неяк зрабілі, праўда, пускалі на іх нават плінтусы.

**Цімафей Макаранка, Віцебск**

## Самае чытанае на nn.by за 1 — 7 снежня

- Дэбаты па сцэнары апазіцыі
- Сустрэча Някляева і Саннікава з выбарцамі на Прывакзальнай плошчы — анлайн
- Хто лаяўся матам падчас тэледэбатаў на БТ? + новае відэа
- Таварышы інтэрнэт–змагары
- Жонка Сідорскага абрала «Чырвоную сукенку»
- Што вы думаеце пра тэлевыступы кандыдатаў? Апытанне на вуліцах
- Рыгор Кастусёў: Масква паставіла на паэта–песенніка
- Някляеў хоча выканаць праграму Лукашэнкі
- Колькі нам каштуе прэзідэнт? $400 мільёнаў у год!
- Лукашэнка апанентам: «Краіну вы не атрымаеце»


# Не ўсё ў жыцці апошні раз!

### Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 4 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

**Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.**

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езда.

**Банкаўскія рэквізіты:**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

### Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

**Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»:** для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

### Дзякуй падпісчыкам, якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Вельмі дзякуем **Міколу Раманаву** (Антверпен) за тыя шматлікія сувеніры й падарункі, якія ён прывёз нашаніўцам з Бельгіі.

# Вернай дарогай

Працяг са старонкі 1.

Лукашэнка збірае хурал перад выбарамі, каб пераканаць у правільнасці ўласнага шляху і паабяцаць, што ў наступнай пяцігодцы жыць будзе яшчэ лепей.

У прэзідыуме побач з дзейным кіраўніком сядзяць асабліва набліжаныя (мітрапаліт Філарэт, дырэктар БАТЭ Анатоль Капскі і іншыя). Ззаду — міністры і даяркі, акадэмікі і камсамольцы. І ўся гэтая ідылія паўдня транслюецца ў жывым эфіры нацыянальнага тэлебачання.

Насамрэч мы маем справу з грандыёзным прамоўшанам аднаго з кандыдатаў у прэзідэнты, непараўнальным са сціпленькімі эфірнымі магчымасцямі іншых. Прамоўшан адбываецца за грошы падаткаплатнікаў.

## Палітыка роўнанабліжанасці

Прамова Лукашэнкі была класічнай для гэтага аратара. Няўхільна расце дабрабыт народа, Беларусь рухаецца ў патрэбным кірунку хуткімі тэмпамі. І бегла б яшчэ хутчэй, каб на Захадзе праклятыя капіталісты не пачалі эканамічны крызіс, а суседка на Усходзе пастаянна не павялічвала цэны на энерганосьбіты.

Паколькі прамова была разлічаная на самую шырокую аўдыторыю, у ёй гучалі рэчы ўзаемавыключальныя. Спачатку — што мы знаходзімся ў атачэнні недружалюбных краінаў. Далей — пра палітыку роўнанабліжанасці як да Расіі, так і да Еўрасаюза. Потым Лукашэнка рытуальнымі словамі «нельга хаваць саюзны праект» пастараўся супакоіць і прыхільнікаў Расіі. Праўда, падчас зваротаў да расійскай тэмы ў словах кіраўніка прарываліся крыўды. «Я прасіў, прасіў, прасіў грошы. У Расіі, дзе нам іх фактычна не...» — пачаў казаць і абсекся Лукашэнка. «Мы ніколі не будзем аднымі, бананавай дзяржавай. Знойдуцца тыя, хто нам дапаможа. Вялікі Кітай аказвае нам усялякую дапамогу», — папярэдзіў ён тых, хто «фактычна не...».

З усяго сказанага можна меркаваць, што паляпшэння ў адносінах з Расіяй не прадбачыцца. Затое ў кантактах з ЗША Беларусь зацікаўленая. І нават гатовая «зрабіць крокі», каб іх актывізаваць.

## «Краіну вы не атрымаеце»

Лукашэнка ні разу не згадаў прозвішчаў апазіцыйных канкурэнтаў. Але іх перадвыбарныя праграмы назваў агулам «папулізмам і пустымі абяцаннямі». «Думаў, што ў дэбатах нешта скажуць — не», — казаў кандыдат, які дэбаты праігнараваў. А цяпер карыстаўся магчымасцю размазаць апанентаў, якія ўжо не будуць мець магчымасці адказаць на тэлебачанні.

Усе кандыдаты абяцаюць вярнуць льготы, казаў Лукашэнка. «Такой раскошы, раздаваць льготы направа і налева, не могуць сабе дазволіць самыя багатыя краіны», — адзначыў ён, нібы забыўшыся на ўласную перадвыбарчую рыторыку мінулых разоў.

На прапанову Уладзіміра Някляева павялічыць сацыяльную дапамогу жанчынам, што нараджаюць дзяцей, Лукашэнка іранізаваў: хіба кандыдат падзеліцца сваімі сродкамі.

Што датычыць праграмы Раманчука пра мільён працоўных месцаў, то дзейсны кіраўнік запэўніў, што гэты самы дзеяч падчас крызісу прапаноўваў мільённыя звальненні людзей з прадпрыемстваў. Але Лукашэнка гэтага не дапусціў. Выратаваў людзей ад беспрацоўя.

Што датычыць абяцанняў Кастуся Статкевіча разагнаць КДБ і правесці люстрацыю, то Лукашэнка паспяшаўся супакоіць, што нічога падобнага не будзе. А за кратамі могуць апынуцца тыя, хто гэта абяцае.

Але самы канкрэтны адказ быў дадзены на словы Міколы Статкевіча: «Вярні, што скраў». «Краіну вы не атрымаеце», — зазначыў Лукашэнка.

## Ні сэксуальных, ні нацыянальных

Прамоўца ўсяляк ствараў карціну стабільнасці ў краіне, якой мудра кіруе. «Дзякуй Богу, што ў нас мірна суіснуюць беларуская і расійская мовы. Ніякай гвалтоўнай беларусізацыі, як і русіфікацыі, у нас не будзе», — казаў ён. Хітом інтэрнэту стаў яго выраз пра нацыянальныя і сэксуальныя меншасці. Зачапіўшы пытанне пра апазіцыйны Саюз палякаў, ён сцвердзіў: гэта — нашы палякі, мае палякі. «У нас няма ніякіх меншасцяў — ні сэксуальных, ні нацыянальных. Нікому не замінаем будаваць храмы».

Закрануў і тэму палітычнай талеранцыі, мякка атаясаміўшы шматпартыйнасць з радыкалізмам: «Нашы людзі не прымаюць палітычнага радыкалізму. Ні ў якую новую палітычную партыю я не пайду, я са старой яшчэ не выйшаў. Я супраць, каб партыя стваралася зверху. Я не супраць партый, калі яны так будуць любіць краіну, як я».

І расказаў, што захоўвае камуністычны партбілет з савецкага часу. Па агульнай арганізацыі хурала гэта адчувалася.

## Крызіс не цётка

І ўсё ж прывід магчымага крызісу блукаў у прамове. Лукашэнка пагадзіўся на шэраг прапановаў, якія раней былі толькі на ўзроўні абмеркавання.

Найперш загаварыў пра адмену смяротнага пакарання. Гэта тое, чаго настойліва дабіваюцца краіны Еўрасаюза, каб пачаўся шлях збліжэння. Лукашэнка сказаў, што вырашаць будзе ўсё адно народ. Але калі кіраўнік дзяржавы загаварыў пра гэта, то без сумневаў, што народ адкажа «ў адпаведнасці з палітыкай партыі».

Лукашэнка загадаў у пачатку наступнага года ўвесці іпатэчнае будаўніцтва. Раней улада на гэта не ішла, баючыся парушаць сацыяльныя гарантыі грамадзян.

Лукашэнка агучыў, што ў краіне няма прадпрыемстваў, якія нельга прыватызаваць. Загаварылі пра прыватызацыю зямлі.

Змяніліся рэаліі, і Лукашэнка вымушаны рэагаваць на гэта.

Апладысменты выклікала абяцанне Лукашэнкі зменшыць колькасць праверак. Фактычна, ён раскрытыкаваў Дзяржкантроль. Тым самым кіраўнік сутыкае розныя сілавыя і кантрольныя ведамствы, каб лягчэй было іх кантраляваць.

Цягам усёй прамовы Лукашэнка сыпаў абяцаннямі: павялічыць заробкі да тысячы даляраў, павысіць пенсіі, падвоіць дапамогу пры нараджэнні дзіцяці, вярнуць ільготны праезд школьнікам, даць палёгкі бізнэсу, скараціць падаткі... Прамову з шыкоўнай залы тры гадзіны транслявалі ўсе каналы нацыянальнага тэлебачання. Куды там раўняць з паўгадзіннымі выступамі апазіцыйных кандыдатаў на фоне шэрай сцяны.

**Зміцер Панкавец**

### Уладзімір Шыла: Надарвецца Лукашэнка, не вытрымае

Жыхар Салігорска Уладзімір Шыла патэлефанаваў у рэдакцыю, каб падзяліцца сваімі ўражаннямі ад выступу Лукашэнкі на ўсебеларускім хурале.

«Я ў Савецкім Саюзе жыў, усё гэта добра памятаю. І каб куры нашы лепш несліся і г.д. Мне нават шкада гэтага Лукашэнку, бо надарвецца, не вытрымае. Складалася ўражанне, што вакол яго гультаі, а адзін ён толькі працаўнік. Згадваецца карціна «Бурлакі на Волзе», толькі я б на пярэдні фон Лукашэнку паставіў».

**ЗП**

### Атракцыён нябачанай шчодрасці

Сказанае Аляксандрам Лукашэнкам на ўсебеларускім народным сходзе не варта ўспрымаць сур’ёзна. Гэты атракцыён нябачанай шчодрасці ставіць спектакль у Беларусі адзін раз на пяць гадоў. А пасля выбараў без вялікай помпы ўсё згортваецца. Потым раптам аказваецца, што даўно вырашаныя праблемы стаяць перад намі зноў.

**Аляксандр Старыкевіч, «Салідаранасць»**

### У Лукашэнкі скончыліся рыфмы

Прамовы Лукашэнкі падчас мінулых выбараў пакідалі больш цэласнае ўражанне. Тады была пэўная яснасць: ідзём наперад правільным шляхам, беларускі цуд бездакорны. Цяпер і сам Лукашэнка ўсведамляе, што нешта трэба мяняць. А вось як? Ці то рыфмы скончыліся, ці то адказы састарэлі, толькі адзінадушныя апладысменты засталіся нязменнымі.

Пакуль.

**Юры Дракахруст, радыё «Свабода»**

# У Някляева і Саннікава свой сход

**Яны сабралі на мітынг каля вакзала 1500 чалавек.**

6 снежня на Прывакзальнай плошчы ў Мінску адбыўся альтэрнатыўны ўсебеларускі народны сход, арганізаваны кампаніяй «Гавары праўду!». У мітынгу актыўны ўдзел узяў і лідар «Еўрапейскай Беларусі» Андрэй Саннікаў.

Рашэнне правесці свой сход у дзень правядзення ўсебеларускага хурала, арганізаванага ўладамі, Уладзімір Някляеў прыняў пасля няўдалай спробы трапіць на праўладнае мерапрыемства.

Падчас мітынгу прамаўлялі Саннікаў і Някляеў, спявалі музыкі Вінцэнта і Змітра Вайцюшкевіча, казалі Генадзь Бураўкін і Аляксей Марачкін.

Кандыдаты заклікалі ўсіх беларусаў адмовіцца ад датэрміновага галасавання і запрасілі на Плошчу 19 снежня, а таксама падпісалі супольную заяву ў ЦВК з патрабаваннем дадатковага эфірнага часу для дэмакратычных кандыдатаў.

Акцыя прайшла ўзнёсла, была добра арганізаваная. На мітынгу мелася добрая гукаўзмацняльная апаратура і нават разборная сцэна з металічных канструкцый. На дробныя правакацыі рэагавала ахова кандыдатаў у прэзідэнты.

**Алесь Пілецкі**



# Пагоня за лічбамі коштам велізарнага доўгу

Прайшоў чарговы Усебеларускі сход. А што выканана з праграмы, прынятай на папярэднім хурале? «Наша Ніва» падлічыла.

Галоўным пасылам уводзінаў у праграму развіцця краіны на 2006—2010 гады было: «забяспечыць пераход краіны на інавацыйны шлях сацыяльна-эканамічнага развіцця». Што такое «інавацыі» ў беларускім разуменні слова, любіць тлумачыць кандыдат у прэзідэнты Яраслаў Раманчук. Ён прыводзіць прыклад «найноўшай» распрацоўкі з Барысава. На тамтэйшым заводзе пластыкавых вырабаў гатовы заняцца шматмільённым інавацыйным стварэннем... аднаразовага пластыкавага посуду. І, дарэчы, ніяк не могуць рэалізаваць праект.

Мэты сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны былі акрэсленыя цьмяна, без магчымасці іх далейшага ацэньвання. «Забяспечыць спрыяльныя ўмовы для ўдасканалення чалавека», «укараніць павышаную сістэму сацыяльных стандартаў», «арганізаваць працу органаў дзяржкіравання ў інтарэсах чалавека»... Хто-небудзь зможа аргументавана даказаць, што гэтыя планы выкананыя альбо наадварот праваленыя?

Некаторыя пункты праграмы былі выкананыя з адваротнай дакладнасцю. «У сістэме агульнай сярэдняй адукацыі прадугледжваюцца завяршэнне рэфармавання агульнаадукацыйнай школы і пераход на 12-гадовае навучанне, стварэнне ўмоў для пераходу да профільнага навучання». Фраза гучыць як здзек для абітурыентаў, якія былі вымушаныя прымаць новыя правілы гульні Міністэрства адукацыі за год да паступлення ў ВНУ.

«Суадносіны кошту квадратнага метра жылля і сярэднямесячнага заробку павінны дасягнуць 0,9 — 1, што забяспечыць даступнасць жылля». Каб рэалізаваць гэты пункт праграмы, ці то заробак у Беларусі павінен узрасці ўтрая, ці то будаўніцтва патаннець у столькі ж разоў. Дарэчы, у 2005—2006 гадах сітуацыя была лепшай, чым цяпер.

У канцы 2005 года замежны доўг складаў $5,1 млрд, а ў верасні 2010 перавысіў $23 млрд.

Цікава, што абяцання пра запаветныя $500 сярэдняга заробку ў праграме не было. Гэта быў адзін з экспромтаў кіраўніка дзяржавы. Што датычна росту заробкаў, то яны планаваліся на ўзроўні 55% у дачыненні да 2005 года. У снежні 2005 заробак дасягаў $261,4. Па стане на сёлетні кастрычнік — $442,5. Місія ўжо выкананая.

Што не ўдалося падняць, дык гэта заробак для людзей, што працуюць у аграрнай сферы. Яны мусілі атрымліваць $320 — 360 у эквіваленце. Але па інфармацыі Белстата, сярэдні заробак у студзені—верасні 2010 года складаў усяго $258.

| Паказчык | Вынікі 2009 г. у дачыненні да 2005 г. (у %) | Вынікі пасля 2010 г. — прагноз (у %) | Задача на 2010 г. (у %) |
|---|---|---|---|
| Валавы ўнутраны прадукт | 131,9 | 140,9 | 146—155 |
| Рост прадукцыі прамысловасці | 132,3 | 146,0 | 143—151 |
| Аб'ём знешняга гандлю. | 152,6 | 178,7 | 153—160 |
| У тым ліку: | | | |
| экспарт | 133,3 | 155,7 | 155—162 |
| імпарт | 171,0 | 200,6 | 151—158 |
| Рэальныя грашовыя даходы | 150,5 | 168,2 | 149—156 |
| Рэальны заробак | 140,8 | 156,0 | 152—158 |
| Увод у эксплуатацыю жылля | 151,9 | 168,9 | 118—132 |

Праграма 2006-га года сканчалася асноўнымі прагнознымі паказчыкамі развіцця эканомікі на канец 2010-га года — ВУП, прадукцыя прамысловасці і сельскай гаспадаркі, аб'ём замежнага гандлю, сярэдні заробак... Хоць справаздачная дата яшчэ не прыйшла, праграму ацэньваюць на чарговым хурале.

«Наша Ніва» паспрабавала самастойна вывесці выніковыя паказчыкі, абапіраючыся на паказчыкі за верасень—кастрычнік гэтага года і тэндэнцыю росту эканомікі краіны. Як бачна, большасць статыстычных паказчыкаў удалося вывесці нават вышэй за план. Што не дацягнулі — дык гэта росту ВУП. Ёсць праблемы і з сальда знешняга гандлю. Імпарт скакнуў ажно на 200%, а вось экспарт ледзь-ледзь залез за ніжнюю мяжу плана — усяго 155,7%.

Але гэта статыстыка. Памятаецца, у СССР яна таксама расла амаль да апошняга, але пры гэтым назапашваліся такія ж эканамічныя дысбалансы.

Пры ацэнцы росту паказчыкаў у Беларусі ў 2006—2010 гадах трэба ўлічваць, што ён дасягнуты ў значнай меры дзякуючы росту замежнай запазычанасці краіны, якая за той самы перыяд вырасла амаль у пяць разоў.

Калі ў канцы 2005 года знешні валавы доўг краіны складаў $5,1 мільярда, то ў верасні 2010 года ўжо перавысіў $23 мільярды і працягвае расці.

**Яўген Васількоў**

# Для якога бізнэсу маразы ў радасць?

Калі адны людзі мерзнуць дома пад коўдрамі, для другіх толькі–толькі пачынаецца гарачы сезон. Які бізнэс можна назваць «зімовым»?

### Сагрэць Прыбалтыку

Дублёнкі ці курткі, шапкі, пальчаткі — традыцыйны зімовы набор вопраткі. А вось знайсці пад іх валёнкі стала складана. Ні ў ЦУМе, ні ў ГУМе, ні ў «Кірмашы» на вітрынах няма смілавіцкіх валёнкаў! Стаяць толькі кітайскія — па 290 тысяч рублёў. Хоць кошт беларускіх звычайна вагаўся ў раёне 75 тысяч рублёў.

Смілавіцкая валяльна-лямцавая фабрыка — адзінае прадпрыемства па выпуску валёнкаў у Беларусі. Год таму дырэктар Васіль Сабан скардзіўся на адсутнасць экспарту і чатырохмесячныя запасы прадукцыі. Халодная зіма дапамагла распрадаць лішкі прадукцыі, але паставіла новае пытанне — як задаволіць усе заяўкі? Выбіраючы паміж айчынным і замежным спажыўцом, прадпрыемства аддало перавагу суседнім краінам.

Тавараназнаўцы ў ЦУМе кажуць, што іх заяўкі на валёнкі больш не прымаюцца, бо тавар Смілавіцкай валяльна-лямцавай фабрыкі адпраўляецца ў Расію і Прыбалтыку. На самім прадпрыемстве каментуюць сітуацыю больш дыпламатычна — маўляў, стараемся забяспечваць валёнкамі ўсіх ахвотных, незалежна ад месца пражывання.

Дарэчы, зборшчыкі подпісаў кандыдата ў прэзідэнты Уладзіміра Някляева адзначалі, што штаб паспеў закупіць вялікую партыю айчынных валёнкаў.


Юлія Дарашкевіч

### «Дапамогуць, калі самі завядуцца»

Чэргі на станцыях тэхабслугоўвання і на шынамантаж у пачатку зімы дасягаюць рэкорднай адлегласці. У кагосьці не заводзіцца правераны дзесяцігоддзямі дызель, хтосьці толькі пасля першых снегападаў вырашыў замяніць лысую гуму. Тыя, хто не даехаў да СТА, ствараюць попыт для службаў аўтадапамогі. Каб замовіць эвакуатар, даводзіцца чакаць пяцьшэсць гадзінаў!

«Калі захочаце запісацца загадзя, можам дамовіцца толькі на наступны дзень, — кажуць аператары службаў. — І зусім не факт, што нашыя эвакуатары самі здолеюць завесціся на марозе». У экстрэмальныя дні аўтадапамога працуе дзень і ноч, транспарціроўка машыны каштуе каля 80 тысяч рублёў і па 1000 рублёў за кіламетр за межамі Мінска.

Дарэчы, пад зімовы шумок тарыфы паднялі амаль усе сталічныя таксісты. Цяпер сярэдні кошт праезду складае 1400 рублёў за кіламетр, а не 1300 рублёў, як было раней.

### Эпоха абагравальнікаў

Прыбытковым бізнэсам называюць і пракат зімовага інвентару — санак, лыж, канькоў. Калі выдаваць яго каля вялізнага катка, а побач наладзіць продаж гарачай гарбаты і піражкоў, грошы пацякуць ракой. 12 тысяч рублёў з кожнага дарослага за канькі і гадзіну катання бяруць каля сталічнага Палаца спорту. Але на каток мала хто ходзіць у адзіноце, а кампанія сяброў прыносіць добры прыбытак. Вось толькі разгарнуць бізнэс можна толькі зімой.

Часцей, двойчы ў год — спякотным летам і марознай зімой — працуюць прадаўцы кандыцыянераў, вентылятараў і абагравальнікаў. Экстрэмальнае надвор'е абарочваецца падвойнай выгадай для іх. Кансультанты мінскага супермаркета «Карона-Тэхна» заўважаюць, што абагравальнікаў ужо прадалі ўдвая больш, чым летась. Ім «дапамагло» сарафаннае радыё з абяцаннямі студзеньскіх маразоў аж да мінус 60 градусаў.

**ЯВ**

## У Беларусі могуць увесці абавязковае медыцынскае страхаванне

Страхоўка на чалавека будзе каштаваць $240.

Дзяржаўная праграма развіцця рынку страхавых паслугаў на 2011—2015 гады можа ўвесці абавязковае медыцынскае страхаванне. Як заявіла генеральны дырэктар Беларускай асацыяцыі страхаўнікоў Арына Мерзлякова, плануецца ў шэсць разоў павялічыць памеры страхавой прэміі на чалавека. Зараз купіць страхоўку добраахвотна можна за $40. Пасля рэформы выплата ўзрасце да $240 — паловы сярэднямесячнага заробку ў краіне.

**ЯВ**

### Сцісла:

• **«Белінвестбанк» прададуць кітайцам?** Краіна вядзе перамовы пра продаж долі ў банку найбуйнейшаму кітайскаму банку. Праз тыдзень у Мінск прыедзе дэлегацыя з КНР. Раней меркавалася прадаць «Белінвестбанк» аднаму з еўрапейскіх банкаў.

• **Беларусь і Украіна абмяняюцца нацыянальнымі валютамі на $125 мільёнаў.** Заключэнне валютнага свопу азначае, што краіны змогуць не выкарыстоўваць даляры ці еўра пры гандлі. Паводле словаў старшыні праўлення Нацбанка Пятра Пракаповіча, мяркуецца заключыць валютны своп і з Літвой.

• **Рэкордны дэфіцыт замежнага гандлю: $6,9 мільярда за 10 месяцаў.** За аналагічны перыяд 2009 года дэфіцыт замежнагандлёвага абароту дасягаў $5,7 мільярда.

**ЯВ**

# Падарункі дэлегатам хурала пацягнулі на $575тысяч

Працяг са старонкі 1.

Самы дарагі падарунак — мікрахвалёўка ад «Гарызонта». У фірмовай краме завода розныя мадэлі каштуюць ад 207 да 283 тысяч рублёў. Паколькі дэлегаты — людзі сур'ёзныя, але разам з тым не марнатраўцы, ацэнім іх печку ў сярэднюю лічбу — 245 тысяч рублёў.

Наступны па цане — партфель ад «Галантэі». Натуральная скура, карычневы колер... Цягне на 172 400 рублёў у каталогу фабрыкі. Гадзіннік на фотаздымку дэлегата больш за ўсё нагадвае той, што ў каталогу «Промня» каштуе 76 440 рублёў. Але на падарунак яшчэ нанесеная гравіроўка! Вядома ж, незадарма. Тым часам кошт набору ўжо падбіраецца да паўмільёна рублёў...

Два фотаальбомы з краявідамі роднай краіны. Сур'ёзныя альбомы — калі гэта не турыстычныя брашуркі — каштуюць па 50 тысяч рублёў кожны. Вядома ж, набор ідэалагічнай літаратуры з пяці кніжак можна назваць бясцэнным. Але можна і паспрабаваць яго ацаніць, хоць у кнігарні знайсці пяць розных кніг па беларускай ідэалогіі складана. 35—40 тысяч рублёў — красная цана для іх.

Пераходзім да канцылярскай драбязы. Камплект, які складаецца з вялікага (фармата А4) і малога (А5) нататніка, каштуе каля 40 тысяч рублёў, арганайзер з фірмовай сімволікай — каля 10 тысяч. Дзве ручкі — пёравая і шарыкавая — у футарале дадаюць да агульнага кошту яшчэ 12—15 тысяч. І апошняе — значок. Калі вырабляць вялікую партыю значкоў у прыватных кампаніях Мінска, за кожны трэба будзе заплаціць 2000 рублёў.

Агулам мы налічылі 700 тысяч рублёў. $230 на кожнага дэлегата. А іх было дзве з паловай тысячы... Агулам на ўсіх — $575 тысяч бюджэтных грошай.

Дарэчы, электронныя звесткі паказваюць, што фота падарункаў дэпутат Васкрасенскі зрабіў тэлефонам Apple iPhone 3G 8Gb. Такія прадаюцца ў Мінску па цане ад 690 да 850 даляраў.

**Яўген Васількоў**



**Падарункавы набор дэлегата**

мікрахвалёўка, партфель, гадзіннік з гравіроўкай, два фотаальбомы, набор ідэалагічнай літаратуры (5 кніжак), 2 нататнікі, арганайзер, 2 ручкі (пёравая і шарыкавая) у футарале, значок.

# Украінская кампанія правядзе экзіт-пол у Беларусі

Але на замову лукашэнкаўскага АНТ.

Кампанія «TNS ва Украіне» мае правесці свой экзіт-пол на выбарах у Беларусі. Пра гэта паведамілі ў Цэнтрвыбаркаме.

Са слоў Ярмошынай, «TNS ва Украіне» атрымала акрэдытацыю ў камісіі пры Акадэміі навук. «Мы накіравалі ў абласныя камісіі ліст, каб ім не рабілі перашкодаў», — заявіла Ярмошына.

Вынікі апытанняў можна будзе апублікаваць толькі пасля выбараў, заявіла Ярмошына, іначай «гэта лічыцца ўплывам на выяўленне волі выбарцаў». Хоць на выбарах 2006 года лукашэнкаўскі «Экаом» абвяшчаў вынікі свайго «экзіт-полу» цэлы дзень праз усе дзяржаўныя каналы.

Доктар навук Мікалай Чурылаў, генеральны дырэктар «TNS ва Украіне», якая існуе на рынку 22 гады, паведаміў, што яго кампанія будзе праводзіць не толькі экзіт-пол, але і шэраг папярэдніх даследаванняў на замову АНТ.

Такі экзіт-пол кампанія ладзіць упершыню за межамі Украіны. Цяпер яна рыхтуе 950 інтэрв'юераў у Беларусі, найперш студэнтаў, каб ахапіць 300 выбарчых участкаў. Чурылаў засцерагае, што вынікі экзіт-полу могуць не супасці з афіцыйнымі вынікамі выбараў. Ён тлумачыць гэта беларускай практыкай «датэрміновага галасавання»: «Мы кваліфікавана працуем менавіта ў дзень выбараў, але людзі яшчэ галасуюць і дома. Мы наўрад ці зможам трымаць упэўнена руку на пульсе, бо ў нас [ва Украіне] няма такога паняцця, як датэрміновае галасаванне».

Як паведамлялася, «Экаом», якому апазіцыя не давярае, зноў мае намер рабіць экзіт-пол. Яшчэ адно апытанне будзе ладзіць БРСМ. Ніхто з незалежных сацыялагічных кампаній магчымасці праводзіць экзіт-полы не мае.

**Мікола Бугай**

# Ворагі самім сабе

Даўно мінулі тыя часы, калі ўсё выглядала так добра — і так кепска — для апазіцыі. Піша **Роджэр Патоцкі**.

19 снежня апазіцыя, здавалася б, мае добрую магчымасць кінуць выклік Аляксандру Лукашэнку. Аўтарытарны кіраўнік рабіў стаўку на абяцанні «квітнення і стабільнасці», але ў Беларусі на дадзены момант няма ні таго, ні другога.

Лукашэнка часта называў апазіцыю ворагамі народа, але сёння апазіцыя паказвае, што перадусім яна люты вораг сама сабе. Яна не змагла аб'яднацца вакол адзінага кандыдата або прапанаваць узгодненае бачанне краіны. Замест гэтага лідары апазіцыі задавальняюць свае індывідуальныя амбіцыі і вузкія інтарэсы. І хоць рэжым слабейшы, чым у 2006, тое самае можна сказаць і пра дэмакратычную апазіцыю.

## Абяцанкі-цацанкі

Праграмы апазіцыйных кандыдатаў, як правіла, сканцэнтраваныя на абяцаннях і бедныя на канкрэтыку. Платформы, прадстаўленыя на тэлебачанні і радыё, з'яўляюцца мешанінай з папулісцкіх абяцанняў «выратаваць беларусаў ад вымірання», спыніць будаўніцтва лядовых палацаў і забяспечыць усіх чаркай і скваркай.

Ёсць, вядома, і сур'ёзныя прапановы па такіх ключавых пытаннях, як прыватызацыя, геапалітычная арыентацыя, валюта, дэмаграфічны спад, дзяржаўныя субсідыі і льготы, канстытуцыйныя рэформы... Але колькасць новых «куміраў» і іх ідэяў дэзарыентуе.

Адзіная праграма апазіцыі, прапанаваная адзіным лідарам апазіцыі, выглядала б прывабнейшай.

## Адзін за ўсіх, усе за аднаго

Якім чынам апазіцыя дала ўцягнуць сябе ў гэтае сюррэалістычнае рэаліці-шоу? Ахілесавай пятой дэмакратычнага руху Беларусі заўсёды была адсутнасць адзінства і агульных дзеянняў. І хоць раскол апазіцыі быў нормай у многіх іншых краінах постсавецкай прасторы, на гэтую заразу асабліва пакутуе Беларусь.

Рэжым разрозненасцю апазіцыі ўмела маніпуляваў. Няздольныя своечасова прыйсці да згоды адносна адзінага кандыдата, каб гэты чалавек мог умацаваць свае пазіцыі, стварыць платформу і звярнуцца да грамадскасці, лідары апазіцыі спрабавалі прывязаць кожнае асобнае рашэнне да пэўнага этапу кампаніі.

Спачатку было абвешчана, што, паводле плана, адзіны кандыдат будзе выбраны з ліку тых, хто змог сабраць найбуйнейшую ініцыятыўную групу, тых, хто здолеў сабраць неабходныя 100 тысяч подпісаў, або тых, хто быў зарэгістраваны ЦВК. У адказ на гэта ўлады раптам зарэгістравалі амаль усіх кандыдатаў. У адрозненне ад 2001 ці 2006 года, ціск спецслужбаў быў мінімальны. Хто хацеў быць кандыдатам, ім стаў, у тым ліку некалькі даволі падазроных персанажаў. Журналіст Аляксандр Класкоўскі назваў гэта «тэатрам абсурду».

## План Б

Стратэгія рэжыму палягае на тым, каб перашкодзіць пратэставаму электарату згуртавацца вакол чалавека, які будзе ўвасабляць апазіцыю, як гэта было ў 2006 годзе. Рэжым далёка не ствярае новага Мілінкевіча — ён спрабуе вярнуць сітуацыю да 2006 года, калі апазіцыяй кіравалі адносна малавядомыя людзі.

Вялікая колькасць супернікаў дыскрэдытуе паняцце альтэрнатывы Лукашэнку і робіць цяжэйшым выбар для электарату, які хоча пераменаў і падаў бы голас супраць Лукашэнкі. Як адзначыў каментатар Дзяніс Лаўнікевіч, «рашэнне пра рэгістрацыю амаль усіх было невыпадковым. Гэта дазваляе «патапіць» мацнейшых кандыдатаў у слабейшых».

Кандыдаты вырашылі прыняць План Б, мінімалісцкую стратэгію сумесных дзеянняў. Яны пагадзіліся супрацоўнічаць адзін з адным, унікаць крытыкі адзін аднаго і ў дзень выбараў узяць удзел у акцыі пратэсту супраць меркаванай фальсіфікацыі выбараў. Але яны не здолелі выканаць нават гэтых абяцанняў. Хоць Някляеў і Саннікаў правялі прэс-канферэнцыю, каб абвясціць «беларускі тандэм», супрацоўніцтва не выходзіць за межы фотааб'ектываў.

Нават на акцыю пратэсту 24 лістапада, якая была абвешчаная «генеральнай рэпетыцыяй» Плошчы 19 снежня, прыйшлі толькі трое кандыдатаў. Відавочна, што такая апазіцыя дапамагае і падыгрывае Лукашэнку.

## А хто-небудзь глядзіць?

Стратэгія рэжыму была сёлета асабліва эфектыўнай, бо Захад абраў палітыку неўмяшання.

Можна біцца аб заклад, што апазіцыя выйдзе з гэтых выбараў аслабленай. Чэрвеньскае даследаванне паказала, што толькі 14% рэспандэнтаў давяраюць апазіцыйным палітычным партыям. Як адзначыў сацыёлаг Алег Манаеў, «іх індэкс даверу ніколі не быў такім нізкім».

Асаблівую ролю ў расколе адыграла, магчыма, наўмысна, кампанія Някляева «Гавары праўду!», якая спрабавала скупіць НДА і партыйных актывістаў.

Найбольш цяжкімі наступствамі выбараў 2010 года можа быць далейшае зніжэнне грамадскай цікавасці да дэмакратычнай апазіцыі.

У 2001 і 2006 гадах аб'яднаная апазіцыя прапаноўвала, прынамсі, акрэслены выбар. Нават калі Лукашэнка дазваляў рэгістрацыю некалькіх сапраўдных ці падстаўных прэтэндэнтаў перад кожнымі выбарамі, выбар быў відавочны: кандыдат аб'яднанай апазіцыі супраць прэзідэнта.

Гэтым разам, з дзевяццю прэтэндэнтамі і некалькімі фаварытамі, карціна затуманілася. Апазіцыйныя актывісты глядзяць тэлевыступы кандыдатаў з захапленнем, але сумнеўна, што гэта павялічыць падтрымку апазіцыі ў цэлым. Можна пачуць скаргі аб тым, што ёсць дзевяць кандыдатаў, а галасаваць няма за каго.

Па-за вузкім колам лідараў апазіцыі ўнутры краіны і ў свеце гэтая кампанія ацэньваецца збольшага адмоўна. У прыватнасці, актывісты прызнаюцца, што збянтэжаныя і расчараваныя лідарамі партый і апазіцыйнымі элітамі.

Незалежныя СМІ і праваабаронцы здолелі аб'яднацца і дамагчыся вынікаў у сваіх сферах, а палітыкі вярнуліся да бясплённых 1990-х.

Адзіны кандыдат ад апазіцыі быў бы найлепшым выйсцем для тых, хто хоча пераменаў у Беларусі, аднак адзіны кандыдат не патрэбны ні палітычным партыям, ні Лукашэнку. Для апазіцыі выбары — гэта выбар будучых лідараў апазіцыі, а не будучага кіраўніка краіны.

## Што рабіць?

Развал Аб'яднаных дэмакратычных сіл, аслабленне палітычных партый, бяссільнасць партыйных лідараў і неэфектыўнасць дробных рухаў могуць перашкодзіць зменам. Існуе рэальная запатрабаванасць у новых лідарах, кансалідацыі груповак і з'яўленні кааліцый, угрунтаваных на ідэалогіі.

На левым крыле пяць партый і прафсаюзаў распрацавалі сумесную праграму. І хоць «Левым сілам» яшчэ трэба знайсці супольнага лідара, яны змогуць зрабіць гэта пасля выбараў.

На правым крыле працэс таксама пайшоў. Хоць Мілінкевіч адмовіўся ад удзелу ў выбарах, ён распачаў стварэнне кааліцыі партый і рухаў на агульнай платформе.

Нягледзячы на расколатасць апазіцыі, рэжым наўрад ці атрымае вялікія дывідэнды ад гэтых выбараў. Танцы Лукашэнкі з Еўропай і спрэчкі з Расіяй працягнуцца. Пытанне не ў тым, ці пацягнуць праблемы рэжыму за сабой новыя магчымасці, а ў тым, ці здолее апазіцыя выправіць свае памылкі і навучыцца на іх. Выхад пасля выбараў з агульным адказам можа стаць добрым першым крокам.

**Роджэр Патоцкі**
прафесар Джорджтаўнскага ўніверсітэта, старшыня дэпартамента Еўропы Нацыянальнага фонду ў падтрымку дэмакратыі (ЗША). Артыкул друкуецца ў скарочаным перакладзе з tol.org.

# «Засунулі пісталет ў рот, крычалі прызнавацца...»

Працяг са старонкі 1.

Усё як у танным дэтэктыве: забойцы, маўляў, вяртаюцца на месца крывавай разборкі (на наступны дзень!). Акрамя таго, на думку операў, гімназісты павінны былі стаць «зручным матэрыялам» для абвінавачвання, бо ўсе трое — з няпоўных сем'яў. Іх выхоўвалі маці-адзіночкі, а Аляксандра Напаюка — бабуля.

Праз два тыдні школьнікі былі арыштаваныя. Прычым следства адразу пайшло па шляху найменшага супраціву — запалохвання сведак і падазраваных, фальсіфікацыі фактаў, прымянення фізічнага і псіхалагічнага гвалту ў адносінах да непаўналетніх з мэтай атрымання непраўдзівых паказанняў. А пасля (калі стала ясна, што зрабіць з невінаватых вінаватых будзе няпроста) — і шляхам зацягвання часу. Спіс парушэнняў заканадаўства следчымі органамі адвакат зачытвала ў судзе больш за гадзіну. А аповед абвінавачаных аб катаваннях, якія ўжываліся ў адносінах да іх у Першамайскім РАУС, нельга было слухаць без унутранага ўздрыгу.

Вось што казаў Аляксандр Логінаў: «Завялі ў кабінет № 19 (там ёсць шторы), было пяць чалавек, зачынілі дзверы на ключ (або зашчапку), спачатку паклалі на падлогу, адзін з іх, які пры затрыманні вёў машыну, дастаў пісталет, прыставіў да лба; засунулі пісталет ў рот, крычалі, каб прызнаваўся. Потым паднялі з падлогі, паклалі на стол жыватом уніз, адзін узяў адкрутку і пачаў круціць перад вачыма са словамі: «Зараз засуну, куды трэба». Затым пасадзілі на крэсла, сталі біць па галаве далонямі. Усё гэта суправаджалася патрабаваннямі прызнацца... Пасля гэтага пратрымалі ў боксе каля 2 гадзін, затым у кабінеце кагосьці з кіраўніцтва было сказана: «Зараз завязём на Дзвіну, возьмем за ногі і патрымаем у вадзе».

Гэта толькі адно са сведчанняў. 16-гадоваму Аляксандру Аўчарову пасля допытаў у РАУС давялося рабіць сур'ёзную аперацыю на селязёнцы. Цалкам магчыма, што менавіта таму Аўчароў далей не фігураваў у крымінальнай справе. Як бы там ні было, але двое з трох хлапчукоў падпісалі пад катаваннямі яўку з павіннай. Тут, акрамя фізічнага прымусу, ролю адыграў і псіхалагічны ціск. Кожнаму з хлопцаў казалі, што сябры ўжо далі паказанні супраць яго і адпушчаныя дадому.

У выніку не абгаварыў сябе толькі адзін з падазраваных (Аляксандр Логінаў).

Цікава, што ў якасці асноўнага сведкі выступала неаднаразова судзімая 15-гадовая (!) жыхарка Віцебска, што трапілася напярэдадні дня забойства на крадзяжы кашалька. Бацькі затрыманых пэўныя, што сведка была падкупленая супрацоўнікамі міліцыі і пайшла на ілжэсведчанне, каб пазбегнуць пакарання за чарговы крадзеж.

У ходзе следства яна мяняла свае паказанні шэсць разоў (падлічана адвакатамі), няправільна паказваючы часам нават месца забойства (не кажучы аб удзельніках). У далейшым у справе з'явіліся і схаваныя сведкі, у ролі якіх выступалі зэкі, якіх падсаджвалі ў камеры да абвінавачаных ужо ў Мінску (калі справа пачала «гарэць», яе перадалі ў рэспубліканскую пракуратуру, следчаму Юрыю Шчацько).

У той жа час, як паказалі адвакаты, шматлікія сведкі абароны дапытаныя не былі або іх паказанні проста не браліся пад увагу. Як, зрэшты, і аб'ектыўнае алібі: раздрукоўкі тэлефонных званкоў паказвалі, што абвінавачаныя не маглі знаходзіцца падчас забойства ў раёне абласной бальніцы, а адзін з іх, Аляксандр Напаюк, і ўвогуле быў на лецішчы за горадам. Але следства гэта ані не збянтэжыла.




**Віцебскі выпадак — не адзіны спрэчны. Пікет актывістаў грамадскай ініцыятывы «Жанчыны супраць беззаконня ў судах і пракуратуры» ў цэнтры Мінска 6 снежня.**

Момант забойства быў адсунуты на час, не забяспечаны алібі (ён у ходзе папярэдняга следства змяняўся некалькі разоў). Усё на свае месцы паставіла толькі паўторная судмедэкспертыза, зладжаная ўжо на запыт суддзі.

Адзначым, што раздрукоўкі тэлефанаванняў абвінавачаных былі прадстаўленыя для азнаямлення адвакатам толькі ў апошні дзень следства.

4 лютага следчы Ю.Шчацько вынес пастанову аб прызначэнні псіхолага-псіхіятрычнай экспертызы для А. Логінава. Як сцвярджае яго бацька Хачатур Хачатуран, асабістую справу сына перадалі ў Навінкі толькі праз 22 дні, а амбулаторная карта з Віцебскага ПНД з'явілася яшчэ праз тыдзень: «Такім чынам, каля месяца майму сыну, змешчанаму ў псіхушку, не рабілі экспертызу. Па асабістай халатнасці следчага мой сын правёў у Навінках на 12 дзён больш. Як гэта адаб'ецца на псіхіцы сына — можна толькі здагадвацца...»

Звароты і скаргі бацькоў у розныя (у тым ліку і самыя высокія) інстанцыі можна было б падшыць у шматлікія тамы (па крымінальнай справе было сабрана 15 тамоў). Хачатур Хачатуран дамогся і асабістага прыёму ў генпракурора Васілевіча: «Амаль гадзіну нас слухаў, але нават не знайшоў час адказаць на нашы скаргі, якія мы асабіста перадалі. Былі толькі адпіскі — нахабныя, грубыя, некампетэнтныя і г.д... І гэта пры тым, што ў «Советской Белоруссии» той жа Васілевіч кажа, што, маўляў, мы такія дэмакраты — у нас непаўналетнія больш за тры месяцы не сядзяць...» Бацька называе гэтую крымінальную справу «справай Міхасевіча № 2».

«Па справе быў праведзены вялікі аб'ём аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў, затрачаныя вялікія дзяржаўныя сродкі. І які вынік?

У ходзе папярэдняга следства не атрымалася і суду не прадстаўленыя доказы, якія дазваляюць зрабіць выснову аб вінаватасці Логінава і Напаюка. З пэўнасцю следства не вызначыла нават час, месца, прыладу здзяйснення забойства. З моманту затрымання адпрацоўвалася толькі адна версія — пра вінаватасць хлопцаў. І была адна мэта ў следства — дамагчыся прызнання віны любой цаной...», — гэта вытрымка з прамовы адваката падчас судовых спрэчак.

Прысуд аб невінаватасці школьнікаў мае ўступіць у сілу 10 снежня. Звесткі пра парушэнні закону ў часе следства будуць накіраваныя на адрас Генпракуратуры. Дарэчы, пракурор прасіла суд даць непаўналетнім абвінавачаным да 14 гадоў турмы...

**«Беларускі партызан»**

## «Стукаліся ва ўсе дзверы»

За дванаццаць месяцаў следства бацькам не дазволілі ніводнага спаткання з Аляксандрам Логінавым.

У гутарцы з карэспандэнтам «НН» Хачатур Хачатуран сказаў, што цяпер рыхтуе лісты на імя старшыні палаты прадстаўнікоў Уладзіміра Андрэйчанкі і кіраўніка КДК Зянона Ломаця. «Мы атрымалі заключэнне суда на 108 лістах. Там прэс выкладзеныя парушэнні ў ходзе следства», — адзначыў ён.

Х.Хачатуран кажа, што дакладна ведае, дзе быў сын у час, калі адбывалася забойства (між 15-й і 17-й гадзінамі): спачатку абедаў у яго дома, а пасля пайшоў да сваёй маці (яны не жывуць разам). Ісці нядоўга, і ў раён абласной бальніцы хлопец ніяк не паспеў бы.

«Вядома, бацькі ўсё скажуць, каб выратаваць дзіця, але на карысць невінаватасці школьнікаў сведчылі і паказанні іншых сведкаў, і факты. Напрыклад, раздрукоўкі званкоў з сотавых і хатніх тэлефонаў. Яны паказваюць, што Логінаў у той час і блізка не быў ад абласной бальніцы», — кажа праваабаронца Павел Левінаў, які прысутнічаў на судзе.

У матэрыялах суда, дарэчы, былі раздрукоўкі гэтых тэлефанаванняў, але ў матэрыялах следства яны чамусьці не фігуравалі. На гэта звярнуў увагу суддзя Андрэй Яфрэмаў.

Следства ішло 12 месяцаў. За ўвесь час следства бацькам не далі ніводнага спаткання з сынам. Суд ішоў 5 месяцаў, усяго было 26 пасяджэнняў. «Уявіце, як гэта было накладна ездзіць з Віцебска ў Магілёў», — кажа Х.Хачатуран. Працэс адбываўся ў Магілёве па рашэнні Вярхоўнага суда. Бо справа атрымала шырокі розгалас.



**Забойства адбылося ў наваколлі Віцебскай абласной бальніцы.**

П.Левінаў адзначае, што сем'і вельмі моцна падтрымлівалі Логінава і Напаюка. «Калі б яны не стукаліся ва ўсе дзверы і калі б не мужнасць Аляксандра, які пад ціскам следства не агаварыў сябе і сяброў, апраўдаць школьнікаў не ўдалося б», — адзначае ён.

Да 10 снежня пракуратура можа аспрэчыць прысуд.

Але як школьнік Аляксандр Логінаў, які паўтара года прабыў за кратамі, будзе даганяць аднакласнікаў? Бацька кажа, што хлопец паспрабуе здаць іспыты на атэстат экстэрнам: «Ён у мяне ў гімназіі на «васьмёркі» вучыўся, выйграваў алімпіяды па матэматыцы. Нават за час знаходжання ў магілёўскім СІЗА напісаў найлепшае сачыненне на тэму «Чаму я хачу выйсці на волю».

**Сяргей Мікулевіч**

### Здарэнні сцісла

• **Выбух у Бабруйску.** У выніку выбуху балона з газам быў моцна пашкоджаны пад'езд шматкватэрнага дома. Сантэхнікі ставілі лічыльнікі, аднак нешта пайшло не так. Адна жанчына накіраваная ў шпіталь з аскепкавымі раненнямі. Уваход у пад'езд разбураны. У кватэрах першых паверхаў павыбівала дзверы.

• **Загінулі, перабягаючы перад электрычкай.** 70-гадовы мужчына і 58-гадовая жанчына, мінчане, былі смяротна траўмаваныя электрацягніком Барысаў — Мінск на станцыі «Загор'е» ў Мінскай вобласці. Муж і жонка перабягалі пуці па пешаходным мастку.

• **Тры малыя сястрычкі загінулі на пажары.** У вёсцы Дзякавічы Жыткавіцкага раёна загінулі трое малых. Напярэдадні позна вечарам дзяўчынак паўтара, трох і пяці гадоў пакінулі ў хаце адных. 24-гадовы бацька і 22-гадовая маці, зачыніўшы дачок, пайшлі да сваякоў у суседнюю вёску Лугаўё. Пажар заўважылі суседзі, ужо калі гарэў дах.

• **Абрабаваў апарат з мяккімі цацкамі.** Беспрацоўны гродзенец забраў каля 50 мядзведзяў, зайцоў, вавёрак, сабак, вожыкаў ды іншых лясных «братоў». Ахвярай злодзея стаў забаўляльны апарат, які ў народзе называюць «васьміногам», на Цэнтральным рынку Гродна. 26-гадовы выкрадальнік здабыў паўсотні «звяроў» коштам ад 2 000 да 13 000 рублёў.

**СМ**

# Таварышы вучоныя

Скажу шчыра: я атрымала задавальненне ад выступаў кандыдатаў у прэзідэнты. Практычна ўсіх. Піша **Ірына Халіп**.



Я радая, што яны могуць казаць па БТ праўду, пра якую з абодвух бакоў экрана ўжо ўсе забыліся. Я апладзірую адвазе нашых кандыдатаў і шчырай рэакцыі людзей на іх выступы.

Адзіная катэгорыя выбаршчыкаў, якая выклікае ў мяне поўнае неразуменне, — гэта нашы шматлікія палітолагі, сацыёлагі, аналітыкі. Карацей, тыя, каго называюць простым словам «эксперты».

Яны, падобна, суткамі, не перарываючыся, з сур'ёзным выглядам сядзяць і шматслоўна разважаюць пра тое, як адаб'ецца на ўспрыманні гледачоў колер гальштука кандыдата Ікс падчас выступу, як зменіць вынікі выбараў пераход кандыдата Ігрэк з беларускай мовы на расійскую, як паўплывае на мэтавую аўдыторыю жэстыкуляцыя кандыдата Зэт. Вы гэта сур'ёзна, хлопцы?

Пра які ўплыў на выбаршчыкаў можна казаць, калі выбарчай кампаніі як такой не існуе? Як можна сур'ёзна абмяркоўваць недахопы праграм або выступаў і дзяліць «мэтавыя аўдыторыі», калі выступы пераследуюць адну мэту — сказаць праўду і паклікаць людзей на Плошчу? Як можна спрабаваць абмяркоўваць рэйтынгі, калі незалежнай сацыялогіі ў Беларусі няма?

У мяне даўно ўзнікла пачуццё, што мы жывём у розных краінах.

Мы жывём у Беларусі — з усімі наступствамі. Яны жывуць у нейкай іншай, спакойнай еўрапейскай краіне, дзе праходзяць сумленныя выбары, дзе дзейнічае свабодная канкурэнцыя, дзе кандыдаты ў прэзідэнты маюць нармальны доступ да СМІ, дзе гэтых самых СМІ наогул незлічонае мноства і можна выбраць любы, дзе выбаршчыкі вольныя ў сваім выбары і ніхто іх не гоніць на датэрміновае галасаванне, дзе ва ўсіх палітыкаў ёсць роўныя магчымасці звяртацца да выбаршчыкаў не толькі два разы перад выбарамі, але і ўсе «міжвыбарныя» гады, дзе можна запускаць у эфір свае ролікі і сур'ёзна выбіраць колер гальштука, афармленне студыі і выпускаць у эфір давераных асобаў.

О, у якой жа цудоўнай краіне яны жывуць! Вечарамі ладзяцца ямчэй у мяккіх крэслах і займаюцца любімай справай — абмяркоўваюць мэтавую аўдыторыю, дыскурсы, фокус-групы і прагназуюць, колькі адсоткаў набярэ той ці іншы кандыдат.

Аналітыкі не турбуюцца, бо выбарчыя камісіі скажуць ім чыстую праўду пра вынікі галасавання. У іх няма патрэбы выходзіць на вуліцу і сутыкацца з рэальным жыццём — усе навіны пра ход кампаніі яны могуць даведацца па тэлевізары. Шкада, што гэтая выдатная краіна так далёка ад Беларусі.

Я памятаю, як палітолаг Валер Карбалевіч у верасні пытаўся ў мяне: «Ну няўжо ты верыш, што Саннікаў збярэ сто тысяч подпісаў? Вядома, не збярэ!» Зразумела, калі палітолаг гэты жыве ў іншай краіне і сочыць за палітычнай сітуацыяй па тэлевізары, то ён і не мог ведаць, колькі подпісаў збяруць Саннікаў і іншыя, таму што на БТ іх імёны былі пад забаронай. Так што як можна яго папракаць у няведанні?

Але калі б эксперт хоць часам выходзіў за межы ўтульнага кабінета ў нармальнае жыццё, то ведаў бы, што людзі гатовыя не толькі ставіць подпісы і галасаваць, але і на плошчу ісці — не дзеля Саннікава ці каго-небудзь іншага, а дзеля сябе і ўласнай будучыні. З іншага боку, памятаю, як дацэнт Бугрова перад выбарамі 2006 года, выпадкова апынуўшыся ў сапраўднай Беларусі падчас запісу інтэрв'ю Аляксандра Мілінкевіча, шчыра раіла яму нешта з нагоды гальштука, дарма што не касцюмер і не стыліст. Затое было ясна, што чалавеку стала цікава паўдзельнічаць у жыцці, а не паглядзець на яго па тэлевізары. Можа, усё ж мае сэнс часам выходзіць з уласнага экспертнага кокана і проста жыць у Беларусі?

Уяўляю сабе, як усе яны будуць з разумным выглядам абмяркоўваць вечарам 19 снежня, ці пасуе шалік кандыдата Ікс да зімовай формы АМАПа, якія шанцы у кандыдата Ігрэк перакрычаць міліцэйскі мегафон — з прыцягненнем вынікаў апошніх сацыялагічных даследаванняў, — і, нарэшце, ці паўплывае негатыўна на мэтавую аўдыторыю кандыдата Зэт кукіш, які ён прадэманстраваў падчас выступу на Плошчы.

Ізноў усё гэта будзе так далёка ад жыцця і ад ісціны, што хочацца запрасіць іх усіх на плошчу. Таварышы вучоныя, прыязджайце са сваёй шчаснай безназоўнай краіны ў нашу няшчасную Беларусь! Прыходзьце на плошчу і далучайцеся да тых, хто тут жыве. Абяцаю, гэта будзе нашмат цікавей, чым сядзець у кабінетах і скрозь тоўстае замерзлае шкло спрабаваць разгледзець жыццё.

**Charter97.org**

**Ірына Халіп**
публіцыстка, карэспандэнтка ліберальнай маскоўскай «Новай газеты». Жонка кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саннікава.

# Таварышы інтэрнэт-змагары

Скажу шчыра: мяне ванітавала ад выступаў кандыдатаў у прэзідэнты. Практычна ад усіх. Піша **Дзяніс Мельянцоў**.



Ад вымучанасці, непадрыхтаванасці і наіўнасці іх прамоваў, ад няўмення публічна выступаць, ад элементарнай непавагі да гледачоў праз чытанне з паперак і паўгадзінных «ізліянняў» плыняў свядомасці на галовы няшчаснага электарату.

Адзіная катэгорыя выбаршчыкаў, якая выклікае ў мяне поўнае неразуменне, — гэта нашыя шматлікія інтэрнэт-змагары і іх клінічная форма — каментатары «Хартыі'97».

Яны, падобна, суткамі, не перарываючыся, з сур'ёзным выглядам сядзяць і шматслоўна разважаюць пра тое, як заціснутая крызісам беларуская эканоміка нарэшце ляснецца, працоўныя выйдуць дружнымі шэрагамі на плошчу, і тады яны — інтэрнэт-змагары — узначаляць гэтую сілу, вынесуць крывавага дыктатара ўперад нагамі з ягонай рэзідэнцыі і пабудуюць у краіне найлепшую ў свеце дэмакратыю.

Вы гэта сур'ёзна, хлопцы-дзеўкі?

Пра якую рэвалюцыю і кіраванне ёю можна казаць, калі лідары апазіцыі не маюць ані разгалінаваных арганізацыйных структур, ані фінансавых рэсурсаў, ані ідэяў, з якімі можна ісці да людзей?

Пра якое кіраванне краінай можа ісці гаворка, калі кандыдат у прэзідэнты не здольны не тое што прапанаваць ясную, зразумелую простаму чалавеку і запамінальную праграму дзеянняў, але і не здольны распавесці ў жывым эфіры пра сваю праграму без шпаргалак, кашы ў роце і трымцення ў голасе?

Пра якое лідарства можна казаць, калі змагары не ведаюць, што ў краіне ёсць незалежная сацыялогія і сацыёлагі і што ўплыў на выбаршчыкаў можна аказваць і без наяўнасці сумленнай выбарчай кампаніі? Можа, варта проста захацець і ўключыць мазгі?

У мяне даўно ўзнікла пачуццё, што мы жывём у розных краінах.

Мы жывём у Беларусі — з усімі наступствамі.

Яны жывуць у нейкай іншай краіне, дзе па вуліцах ходзяць акупанты, штодзень забіваюць і гвалцяць іншадумцаў і апазіцыянераў, людзей мораць голадам і прымушаюць класціся пад натаўскія танкі, а 100% насельніцтва на кухнях будуюць планы па пабудове палатачнага гарадка на Кастрычніцкай плошчы і люстрацыі лукашэнкаўскіх калабарантаў з асобым цынізмам.

О, у якой жа цудоўнай краіне яны жывуць! Вечарамі ладзяцца ямчэй у мяккіх крэслах і займаюцца любімай справай — размяркоўваюць партфелі міністраў у будучым урадзе Вольнай Беларусі. Змагары не турбуюцца, бо ўсю працу за іх зробіць сусветны крызіс, хцівыя маскалі з іх дарагім газам і нафтай ці ўрэшце тыя ж натаўскія танкі.

У іх няма патрэбы выходзіць на вуліцу і сутыкацца з рэальным жыццём — усю інфармацыю пра жыццё і патрэбы людзей яны даведаюцца з сайта «Хартыі» і з ЖЖ.

Але калі б змагар хоць часам выходзіў за межы ўтульнага офіса ў нармальнае жыццё, то ведаў бы, што людзі не цікавяцца тым, як будзе адбывацца люстрацыя, хто і як будзе шукаць зніклых апазіцыянераў і якія менавіта дыскрымінацыйныя захады ў адносінах да незалежных СМІ будуць адмененыя. І тым больш нікога не цікавіць, што скажа кандыдат Ікс на Плошчы Каліноўскага, пасля таго як атрымае свае 5% галасоў 19 снежня.

Можа, усё ж мае сэнс часам выходзіць з уласнага апазіцыйнага гета і проста жыць у Беларусі?

Уяўляю сабе, як усе яны будуць з разумным выглядам абмяркоўваць, якую маральную перамогу яны атрымалі 19 снежня, колькі ачкоў яны набралі, патусаваўшыся на Плошчы і пагразіўшы кулаком Адміністрацыі прэзідэнта, і колькі ж цяпер бабла адваляць на падтрымку офіса да наступных выбараў. І зноў усё гэта будзе так далёка ад жыцця і так далёка ад ісціны.

Таварышы змагары, прыязджайце са сваёй віртуальнай краіны ў нашу рэальную Беларусь!

Чытайце разумныя кніжкі, аналітыку даследчых цэнтраў і сацыялагічных лабараторый, якіх у нас больш, чым вам здаецца. Паездзіце ў грамадскім транспарце і па рэгіёнах і далучайцеся да тых, хто тут жыве. Абяцаю, гэта будзе нашмат цікавей, чым сядзець у офісах ды інтэрнэтах і скрозь тоўстае замерзлае шкло спрабаваць разгледзець жыццё.

**Дзяніс Мельянцоў**
аналітык незалежнага Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў.



# Дэбаты па сцэнары апазіцыі

Дэбаты кандыдатаў у прэзідэнты на нацыянальным тэлебачанні праходзілі ўпершыню ад 1994 года. Праўда, тады яны былі больш класічнымі — кандыдаты сустракаліся адзін на адзін. Тады ў іх удзельнічаў і малады кандыдат Аляксандр Лукашэнка.

Сёлета ж вопытны кіраўнік дзяржавы дэбаты праігнараваў. Ды і праходзілі яны ў дзіўным фармаце, калі ў студыю запрасілі абсалютна ўсіх прэтэндэнтаў і далі часу ўсяго адну гадзіну.

Задаваць нязручныя пытанні ім паставілі Юрыя Пракопава і Андрэя Крывашэева — вядучых аналітычных праектаў БТ. Абодва неаднаразова палівалі брудам апазіцыю.

Нешта падобнае мелі яны на мэце і гэтым разам. Ад пачатку ўзялі вальяжны хамаваты тон. Але кандыдаты дружным фронтам супрацьстаялі. Першае іх пытанне да Кастусёва было аб тым, чаму ён назваў Саннікава і Някляева прарасійскімі. Яўна, вядучыя спадзяваліся, што кандыдаты ад першага пытання пачнуць паміж сабой грызціся. Нічога падобнага!

Прадстаўнік БНФ адказаў, што «без вашай дапамогі паразмаўляў з імі сам, разабраўся». Адзначу, што на свае пытанні не атрымаў адказу толькі ад аднаго чалавека, намякаючы зноў на адсутнага Лукашэнку.

Саннікаў падтрымаў Кастусёва: «Да пачатку лжывай перадачы мы дамовіліся ігнараваць пытанні вядучых».

Пракопаў і Крывашэеў поўнымі гаспадарамі ў студыі так і не сталі. Як толькі яны спрабавалі браць на сябе ініцыятыву, кандыдаты іх дружна абсаджвалі.

Героем пачатку дэбатаў быў Уладзімір Някляеў. Ён назваў БТ «лёкайскім» тэлеканалам. Някляеў сказаў, што не бачыць у гэтым шоу ніякай карысці, і пакінуў залу. Яму запладзіравалі Саннікаў і Ус. Але калі вядучы паспрабаваў пракаментаваць сыход анекдотам пра паручніка Ржэўскага, кандыдаты дружна яго абсеклі.

Саннікаў казаў, што дзяржаўная машына прабуксоўвае з прычыны «лысай гумы, якую трэба мяняць». Кандыдата спрабавалі падкалоць заўвагай пра цэнзуру на сайце «Хартыя-97», але ён гэтага нібыта не заўважыў.

Статкевіча назвалі не Мікалаем, а Міхаілам. Кандыдат іх папраўіў. Статкевіч працягнуў сваю практыку звароту да «адной асобы» без называння прозвішча. «Калі верыць БТ, у цябе завоблачны рэйтынг. Чаго ты баішся? Правядзі чэсныя выбары, адмяні папярэдняе галасаванне, пусці апазіцыю ў выбарчыя камісіі, дакажы нам нашу нікчэмнасць!» Рыгор Кастусёў звярнуўся да афіцэраў войска, МУС і КДБ з заклікам «трымацца закону, быць грамадзянамі» ў час выбараў.

Міхалевіч паабяцаў цягам свайго прэзідэнцкага тэрміну «адкрыць Беларусь на Еўрасаюз». Саннікаў жа запэўніў, што за гэты час нават можна ўвайсці ў склад ЕС.

Двойчы за час дэбатаў вядучыя спрабавалі падчапіць Кастусёва: «А вось спадар кандыдат прапануе ўвесці талер...» — але атрымлівалі калектыўны адпор. «Расія нам патрэбная, як і Расіі патрэбная Беларусь. Суседзяў не выбіраюць», — адказаў Р.Кастусёў.

«Дастаткова, каб беларуская ўлада не крала ў людзей, — адказаў Рымашэўскі на пытанне вядучых пра абяцаныя крэдыты пад 1—2%. — Сёння Лукашэнка атрымлівае на Захадзе крэдыты пад 1,5%, а дае людзям пад 14—15%». А на розніцу — «добра жыве сам, добра плаціць вам».

Адзінства пазіцыі кандыдатаў выявілася нават у тым, як яны дабіваліся, каб далі слова небараку Дзмітрыю Усу.

У фінале Юры Пракопаў паспрабаваў «падсумаваць вынікі», аднак кандыдаты жорстка запатрабавалі не адбіраць у іх час.

Нават у развітальных словах кандыдатаў адчувалася пэўная еднасць. Адны заклікалі прыходзіць на плошчу, іншыя — не галасаваць датэрмінова, трэція прасілі дадатковы час на БТ.

«Карцінка» скончылася, павісла застаўка. За ёй некалькі секунд яшчэ былі чуваць галасы. Кастусёў казаў: «Дапамажыце нам атрымаць эфірны час». Нехта з вядучых: «Ды чым мы вам паможам...»

Апёкшыся на тэледэбатах, Белтэлерадыёкампанія сустрэчу на радыё правяла мірна. Вядучы не правакаваў. Але і кандыдаты прысутнічалі толькі тры: Кастусёў, Міхалевіч і Цярэшчанка. Астатнія накіравалі на эфір давераных асобаў або ўвогуле праігнаравалі, як Лукашэнка, Саннікаў і Ус.

Радыёдэбаты ў нядзельным эфіры былі апошнім рэгламентаваным выступам незалежных кандыдатаў на дзяржканалах. Назаўтра каналы транслявалі трохгадзінную прамову Лукашэнкі на ўсебеларускім сходзе.

**Сяргей Мікулевіч, Зміцер Панкавец**

**Лукашэнку прапанавалі месца міністра сельскай гаспадаркі**

Старшыня АГП Анатоль Лябедзька, які падчас радыёдэбатаў прадстаўляў Яраслава Раманчука, у эфіры паўжартам увявіў урад прэзідэнта Раманчука з наяўных кандыдатаў: Някляеў — міністр культуры, Саннікаў — замежных спраў, Статкевіч — абароны, Кастусёў — ЖКГ. Нават Лукашэнку знайшлося месца міністра сельскай гаспадаркі.



## Хто лаяўся матам падчас тэледэбатаў?

Інцыдэнт адбыўся пасля таго, як Уладзімір Някляеў пакінуў тэледэбаты. Вядучы Крывашэеў паспрабаваў быў з гэтай нагоды распавесці анекдот пра паручніка Ржэўскага, аднак яго рашуча перапыніў Віталь Рымашэўскі, выратаваўшы сітуацыю. Завязалася перапалка, у якую адразу ўступілі іншыя кандыдаты.

Гэта быў пераломны момант дэбатаў — зрабілася ясна, што гэтым разам «салодкая парачка» тэлевядучых не зможа проста так паліваць граззю апазіцыйных палітыкаў.

Слова далі Міколу Статкевічу. Ён таксама даў адлуп вядучым, у рэзкай форме параіўшы не забіраць час на выступ у кандыдатаў. Вось тут, відаць, у некага не вытрымалі нервы — у эфіры прагучала прамоўленая шэптам фраза «пошел на х...»

Логіка падказвае, што мікрафоны, з якіх ідзе гук у эфір, павінны мець толькі тыя, хто непасрэдна прамаўляе — вядучыя і выступоўцы. Хто з іх дазволіў сабе нецэнзуршчыну — можаце меркаваць самі.

**СМ**

## «Пракопаў і Крывашэеў дыскрэдытавалі прафесію»

На сайце «Вэб-журналіст», дзе вучацца пісаць для інтэрнэт-выданняў студэнты журналісцкага факультэта БДУ, з'явіўся каментар, прысвечаны тэледэбатам. Ён называецца «Журналістам можаш ты не быць...». Аўтар разглядаў паводзіны вядучых БТ з прафесійнага пункту гледжання.

«Мець журналісцкае пасведчанне — гэта яшчэ не значыць быць журналістам, — піша Руслан Ігнатовіч. — Вядучыя гэтым разам у наўпростым сэнсе дыскрэдытавалі сваю прафесію, як ніколі зрабіўшы актуальнай яе характарыстыку як другой старажытнай.

«Астапаў панесла» ўжо на самым пачатку тэледэбатаў. Адразу пасля таго, як студыю вырашыў пакінуць Уладзімір Някляеў. Паэт і кандыдат на пасаду прэзідэнта скарыстаўся сваім правам. Сапраўды так, дарэчы, як Аляксандр Лукашэнка».

Праз дзень артыкул знік з сайта.

**СМ**

## БТ хлусіць

Напрыканцы дэбатаў было агучана, што прозвішча Аляксандра Лукашэнкі за гадзіну эфіру паўтаралася 55 разоў. Юры Пракопаў потым яшчэ некалькі разоў падкрэсліваў гэтую лічбу. Аднак інтэрнэт дае магчымасць пераглядзець трансляцыю і ўважліва пералічыць згадкі. Дык вось уласна прозвішча «Лукашэнка» згадваецца менш за 10 разоў. Разам з «Аляксандрам Рыгоравічам» і «прэзідэнтам» — каля 15 разоў. Калі яшчэ дадаць звароты Статкевіча «ты», выйдзе не болей за 25 разоў цягам дэбатаў.

Свім аргументам БТшнікі хацелі паказаць, што кандыдаты менш часу надаюць сваёй праграме, а болей — Лукашэнку. Няўжо думалі, што іх «статыстыку» ніхто не праверыць?

**ЗП**

## Статкевіч: Хай самі думаюць, што са мной рабіць

Выступ Міколы Статкевіча па Беларускім тэлебачанні імпанаваў сваёй смеласцю. Кандыдат наўпрост у вельмі жорсткай форме звярнуўся да Лукашэнкі. Ці не баіцца Статкевіч магчымых наступстваў?

**Мікола Статкевіч:** Я ў гэтым жыцці баюся толькі трох рэчаў: Бога, за родных і людзей, што за мной ідуць, а таксама не спраўдзіць іх чаканні. Больш нічога.

**«НН»: А варыянт, што могуць адпомсціць, разглядаеце?**

**МС:** Не думаў пра гэта. Хай ён сам пра гэта думае.

**«НН»: Выступ рыхтавалі ці ён быў спантанным?**

**МС:** Загадзя падрыхтаваў. Усе свае прамовы пішу выключна сам. Тут ёсць некаторыя асабістыя моманты, якія іншаму чалавеку напісаць цяжка. Некалькі разоў рэпеціраваў прамову перад кімсьці. На тэлебачанне бяру з сабой прыкладны план прамовы. Па ім і арыентуюся. Ведаеце, раней Лукашэнка ўзгадваў маё прозвішча. Цяпер жа не называе, калі нешта кажа пра мяне. Я таксама імкнуўся не называць ягонае, бо грэбую ім.

**«НН»: А самі сваім выступам задаволеныя?**

**МС:** Найперш хацеў нешта данесці не тым людзям, што і так усё разумеюць, а тым, хто хоча зразумець. Можа і таму мой першы выступ быў больш лагодны. Часам карыстаўся нейкімі намёкамі, каб яны самі маглі дадумаць. Прыйсці да пэўных высноў. Апошняя частка майго другога выступу была ўжо разлічана на людзей актыўных. Хацелася, каб мяне зразумела больш людзей, таму на ТБ быў вымушаны ў асноўным размаўляць па-расійску, па радыё — ужо па-беларуску.

**«НН»: Выступы скончыліся, што цяпер?**

**МС:** Ну вось сёння маю праграму надрукавалі ў «Советской Белоруссии» і «Мінском курьере». Буду ездзіць па краіне цяпер. Таксама не ўдалося адкрыцыя ад паездкі ў Берлін.

**«НН»: Здымацца з выбараў не будзеце?**

**МС:** Такога падарунка ім не зраблю. Хай самі думаюць, што са мной рабіць. Адзіны кандыдат — гэта было б добра. Але яны вырашылі зарэгістраваць усіх. Думалі, што кандыдаты адзін аднаго дзяўбці будуць. А цяпер мы маем кандыдатаў на любы густ. І кожны з іх па-свойму крытыкуе гэтую ўладу.

**Гутарыў ЗП**

# Мама Раманчука: «Гарантую, што ўлада не сапсуе Ярыка»

Рэпартаж з роднай хаты кандыдата ў прэзідэнты.

Мястэчка Сапоцкін — самы край Гродзенскай вобласці. Адсюль усяго 20 км да абласнога цэнтра, а да Польшчы і Літвы яшчэ бліжэй. За Сапоцкінам пачынаюцца лясы, сцежкамі якіх можна за гадзіну-другую пехам дабрацца да Еўрасаюза. Край называюць беларускай Прусіяй, бо пасля апошняга падзелу Рэчы Паспалітай ён, адзіны ў Беларусі, пэўны час належаў не да Расійскай імперыі.

У інтэрнэт-энцыклапедыі называецца ўсяго адзін вядомы ўраджэнец краю — эканаміст Яраслаў Раманчук. Гэты факт і стаў нагодай завітаць у Сапоцкін. Тут жыве маці прэтэндэнта на прэзідэнцкую пасаду. Ужо паўгода як жыве адна. Бацька Яраслава памёр. Жалоба па ім, казаў Раманчук, і адклала яго меркаванае вяселле з выбранніцай Алесяй.



Марыя Адольфаўна з сынам.

### Польскасць вымірае

За кіламетраў пяць да Сапоцкіна скрозь туман заўважаем мужчыну, што рушыць у бок мястэчка і без асаблівай надзеі галасуе. Можа, раскажа што цікавае пра сям'ю Яраслава?

Аказваецца, выпадковы спадарожнік працаваў з бацькам палітыка. «Часлаў рабіў усё жыццё электрыкам, як і я, а маці на ферме малако прымала. Вельмі добрая сям'я!» — кажа ён.

У пары слоў абмалёўвае «сітуацыю на месцах»: «У Сапоцкіне ёсць свая апазіцыя. Недзе палова насельніцтва гатовая галасаваць за Раманчука. Настаўнікі — дык усе за яго. Палякі Раманчука больш падтрымліваюць, а вось беларусаў тут мала» — «А вы самі за каго?» — «А ні за кога, — ці то шчыра прызнаецца, ці то пускае пыл у вочы ён. — Мая жонка замест мяне галасуе, я не ўнікаю ў гэта ўсё».

Кажа, што Сапоцкін вымірае. Няма працы — цагельню і крухмальную вытворчасць закрылі. І пякарню таксама. Бальніцу скарацілі. З трох калгасаў зрабілі адзін СВК, і той у суседніх Рацічах.

Моладзі амаль няма, а тыя, хто ёсць, едуць у Гродна. У Польшчу мала хто з'язджае. А як жа: «Тут усе цяпер размаўляюць па-расійску, польскай трымаюцца толькі старыя людзі. Калі я ў 1970-х прыехаў сюды з Гомельшчыны, нічога не мог зразумець — усё па-польску. А цяпер іначай».

### Хата катоў

Паварот, і справа з'яўляецца акуратны жоўты дом. На падворку — яшчэ адна хата.

Марыя Адольфаўна, мама Яраслава, запрашае: «Ах, родненькія! Аж з Мінска прыехалі!» Заходнебеларуская гасціннасць — на стале адзін за адным з'яўляюцца прысмакі. І ні кроплі алкаголю — дзіва што Раманчук зусім не п'е. На падлозе кешкаюцца каты. Адзін, другі, трэці... — не злічыць!

Заварваючы гарбату, Марыя Адольфаўна тлумачыць, чаму жыве ў меншай хаце: «Там вялікі дом, на чатыры пакоі, мне не хапае сіл нацягаць дроў, каб прапальваць яго, дык я перабазавалася сюды». Пані Марыя размаўляе з гасцямі на трасянцы, але часцяком перасkоквае на роднае «пшэпрашам».

Яна запрашае пaглядзець вялікі дом. У ім чыста і прасторна, на паліцах — сотні кніг. І класічная літаратура, і падручнікі, і працы Яраслава. «О, Ярык чытаў! Пакуль у школу пайшоў, дык усе кнігі — і дзіцячыя, і дарослыя!» — з гонарам кажа мама палітыка.

Сярод дэмакратычнай беларускай прэсы заваляўся спецвыпуск расійскага мужчынскага часопіса GQ, прысвечаны «ліхім 90-м».

У пакоях многа абразоў, а на адной са сценаў вісіць велізарнае палатно Божай маці ручной працы. Яго падарыў Раманчукам на залатое вяселле ксёндз. «Мы вернікі. Я заўсёды кажу: хто з Богам, той усё робіць добра», — расказвае гаспадыня.

У шафе — дзясяткі грамат Яраслава. «Вось залаты медаль за школу, — паказвае мама. — А пасля яшчэ і чырвоны дыплом быў!»

Выходзім у двор. Цяперашняя гаспадарка — дзесяць курэй, сабачка на ланцугу ды каты. Іх ажно пяць. «Калісьці і свіней трымалі, а вось каровы сваёй не было, — прызнаецца пані Марыя. — Я 45 гадоў працавала на малаказаводзе, дык малака не трэба было купляць».

### Яшчэ не бацька, але ўжо дзядуля

Марыя Адольфаўна пачынае расказваць пра сыноў. Старэйшы брат Яраслава — Гена. Але па пашпарце не Генадзь, а Генрых. Старэйшы за Ярыка на сем гадоў.

Аказваецца, прэтэндэнт на пасаду прэзідэнта ўжо дзядуля! У Генрыха двое дзяцей — сын і дачка, якая ўжо выйшла замуж і паспела нарадзіць двух дзетак. Адзін з іх, Артур, цяпер вучыцца ў Любліне. А перад тым два гады хадзіў у Гродне ў польскую школу. Яраслаў дапамагае стрыечнаму ўнуку. Прывёз з Амерыкі ноўтбук.

Восем гадоў таму брат Яраслава з'ехаў на заробкі ў Партугалію, але неўзабаве мае вярнуцца. Пішa адтуль, што цяпер няма працы, як у Беларусі, а мо яшчэ і горш.

Яраслаў бывае ў бацькоўскай хаце раз на месяц.

Паколькі гаворка зайшла пра сям'ю, пытаемся, што скажа свякруха пра будучую нявестку, Яраслававу абранніцу? На жаль, сын яшчэ не паспеў пазнаёміць маму з Алесяй. Пра нявестку пані Марыя чула толькі з яго словаў.

### «Кулака» ў старшыні

«Мой бацька памёр у 49 гадоў, бо яго раскулачылі. Яго хацелі зрабіць старшынёй калгаса, а ён адмовіўся, бо не мог зразумець, як жыць у такіх умовах. Яго не выслалі, але забралі ўсё ў калгас. Бацька за два месяцы і згараў, хоць крэпкі мужык быў, — расказвае гаспадыня. — Працавіты быў! Нават у вайну мы ніколі не галадалі».

«Немцы нам нічога дрэннага не рабілі, бо партызанаў у нас не было, — кажа мама Раманчука. — Але як прыйшлі саветы, то нацярпеліся».

Марыя Адольфаўна нарадзілася на мяжы, пад польскай Кузніцай. Калі пераехала ў Сапоцкін, будучы муж Часлаў быў яшчэ ў арміі.

Жыццё ў Саюзе стала для яе часам змагання: «Тут нельга было па-польску размаўляць, нельга было ў касцёл хадзіць, але я наперакор усім ішла. Я ў свой час вывучылася ў Пінску на тэхнолага. Людзей з такой адукацыяй не было, таму мяне і не звальнялі. Начальнік прасіў: будзе праверка, размаўляй хаця б з імі парасійску. А я адказвала: як умею, так і буду казаць».

Браты Раманчукі былі хрышчоныя яшчэ ў маленстве. Прычым калі Яраслава ў касцёл адвезлі адкрыта, то Генрыха давялося хрысціць таемна, у дзве гадзіны ночы. Такія былі часы.

Марыю Адольфаўну абурае, што моладзь адыходзіць ад касцёла. Яраславу яна сказала адразу: «У Мінску ты як хочаш, але тут мусіш ісці ў касцёл».

Парадаксальна, але ліберальныя погляды Раманчука, якія выказваліся ў інтэрв'ю пра легалізацыю прастытуцыі і прымальнасць групавога сэксу, ніякім чынам не суадносяцца з поглядамі на жыццё пані Марыі.

### Сіноптык з-пад Казахстана

Па словах мамы, Яраслаў ніколі ў жыцці не зубрыў. Вельмі адораны. «Аднойчы ў чацвёртым класе прыйшоў і плача. «Мама, я напісаў сачыненне, настаўніца прачытала, сказала, што гэта не я зрабіў!» А ён пры мне пісаў, без кніжак, без нічога... Тады я сустрэла гэтую настаўніцу, усё ёй растлумачыла. І пасля таго яна пачала яму ставіць пяцёркі», — узгадвае пані Марыя.

Ва ўніверсітэце Яраслаў атрымліваў спачатку павышаную стыпендыю, а пасля — ленінскую. Грошы прывозіў дахаты: «Ён жа не курыць, не п'е. Я іх адкладала на ашчадкніжку, — са шкадаваннем прызнаецца Марыя Адольфаўна. — Дык яны і ляснулі ўсе, як Савецкі Саюз скончыўся».

Калі Раманчук вучыўся на першым курсе, яго забралі ў армію, хоць звычайна забіралі з трэцяга. Яраслаў напісаў у дакументах, што паляк. «Ну, мы табе, паляку, пакажам!» — сказалі Раманчуку і заперлі яго на мяжу з Казахстанам. Там ён служыў на аэрадроме сіноптыкам.

На ўніверсітэцкіх здымках Яраслаў выглядае сапраўдным навукоўцам у вялікіх акулярах. Цяпер, пасля ўдалай аперацыі, зробленай у ЗША, яму не трэба насіць ні акуляраў, ні кантактных лінзаў.

Калі Раманчук скончыў лінгвістычны ўніверсітэт, яго пакінулі выкладаць. Аднойчы, прыехаўшы дамоў, ён пачаў разважаць: «Мама, каб мне купіць кватэру ў Мінску, трэба будзе працаваць на цяперашнім месцы 54 гады». І пайшоў у бізнэс.

### «Я не прашу ў Бога, каб Ярык стаў прэзідэнтам»

«Я не хацела, каб ён балатаваўся, бо нашы выбары — гэта ж абы-што, а не выбары. Старшыня сельсавета з Яраславам у дзяцінстве сябравалі. Я сказала яе маці: хай толькі падтасуе сёлета ў Сапоцкіне!» — жартам пагражае Марыя Адольфаўна.

Людзі Раманчука паважаюць. Пару гадоў таму Ярык прыехаў выступаць, і так людзям спадабалася ягоная прамова, што адзін нават назваў сваю дачку ў ягоны гонар, Яраславай.

Пані Марыя выпісвае «Народную волю», глядзіць «Белсат», разважае пра інфляцыю і рост грашовай масы.

«Калі Яраслаў прыязджае, ён на сваім ноўтбуку мне ўсё паказвае», — хваліцца гаспадыня.

«У 1994-м я галасавала за Лукашэнку, — прызнаецца Марыя Адольфаўна. — А Ярык тады ўжо казаў: мама, ён дурнаваты. Больш я за Лукашэнку не галасавала. А вось Пазняка я не люблю. Краіна шматнацыянальная, нельга так, што ўсё раз — і па-беларуску. Хоць ва ўрадзе чыноўнікі павінны размаўляць па-беларуску, як і на тэлебачанні. Калі ў народа няма мовы — то няма і народа».

### Парады Пазняку

У хату заходзіць суседукраінец, які жыве ў Гродне, але купіў участак у Сапоцкіне. Ён адразу ж падхоплівае тэму: «Ярыка ўчора па «Белсаце» паказвалі! Але малавата яму часу далі. Не ведаеце, ці зарэгістравалі ўжо Ярыка?»

У мястэчку ледзь не ўсе хаты маюць спадарожнікавае тэлебачанне.

Сусед таксама згадвае Пазняка: «Калі б ён быў не такім нацыяналістам, даўно былі б у дэмакратычнай Еўропе! А ён усіх на беларускую пераводзіць пачаў...»

Марыя Адольфаўна адразу ж перабівае: «Не, беларус павінен размаўляць па-беларуску!»

### Паэт ні ў чым не разбіраецца

«Ну хто падтрымае Раманчука? Палякаў на Магілёўшчыне не любяць...» — задаем правакацыйнае пытанне.

«Прычым тут паляк? — шчыра не разумее Марыя Адольфаўна. — А Лукашэнка хто? Ніхто, цыган нейкі. Ярык не за палякаў, а за ўсіх. Някляеў, ён хто? Паэт нейкі, ні ў чым не разбіраецца. Наш дык працаваў шмат. Я вам гарантую, што Яраслава не сапсуе ўлада. Ён звычайны, просты чалавек. Няхай бы стаў прэзідэнтам. Ён ведае, як вывесці краіну з крызісу. Але я не прашу ў Бога, каб Ярык быў прэзідэнтам. На ўсё воля Божая».

**Яўген Васількоў, Адар'я Гуштын, Мінск—Сапоцкін**

# Аўтастопам ад Нью-Ёрка да мыса Горн. Частка I. ЗША

Яны прыляцелі ў Нью–Ёрк у красавіку без цэнта ў кішэні. З сабой маюць спальнікі, лекі і табурэт, які прысягнулі паставіць на мысе Горн. А яшчэ гітару ды скрыпку, з дапамогай якіх зарабляюць па дарозе. За сем месяцаў яны прайшлі–праехалі аўтаспынам і пехадралам усе ЗША, Мексіку, цэнтральнаамерыканскія Гватэмалы і Гандурасы. Цяпер яны ў Эквадоры. «Наша Ніва» распачынае публікаваць захапляльныя падарожныя дзённікі Аўгінні Манцэвіч. Чацвёра беларусаў пачынылі гэты аўтастоп праз абедзве Амерыкі. Адна дзяўчына адразу саскочыла. Трое працягваюць ісці. Гэта **Кірыла Краўцоў** — капітан каманды, фатограф. Гэта **Жэня Манцэвіч** — журналістка, скрыпачка, акрабатка і аўтарка гэтага дзённіка. Гэта **Верасень** — аператар, гітарыст.



Аўгіня, Верасень, Віка (засталася ў Нью-Ёрку) і Кірыла.

У 2005 годзе малады ўкраінскі рэжысёр Лёня Кантэр, седзячы з сябрамі на кіеўскай кухні, прапанаваў: «А давайце аднясем гэтыя табурэткі, на якіх цяпер сядзім, да чатырох акіянаў». Нядоўга думаючы, сябры праехалі аўтаспынам праз Польшчу, Нямеччыну, Францыю і — на мысе Ла-Рашэль усталявалі першы табурэт.

Праз год помнік чарговаму зэдліку з'явіўся на ўзбярэжжы Індыйскага акіяна. Дзеля гэтага Лёня і каманда прайшлі Манголію, Кітай, Тыбет, Непал, Індыю, Шры-Ланку.

У 2007-м трэцяя табурэтка з кіеўскай кухні пабывала ў Беларусі, Літве, Латвіі, Эстоніі, Расіі, Фінляндыі, Нарвегіі ды засталася стаяць на архіпелагу Шпіцберген, які абмываецца Паўночным Ледавітым акіянам.

Гэтай вясною стартаваў чацвёрты і апошні табурэт. Ён на шляху да мыса Горн і Ціхага акіяна. Свае зэдлікі панеслі таксама беларуская і расійская каманды. Шлях ідзе праз ЗША, Мексіку, Гватэмалу, Гандурас, Нікарагуа, Коста-Рыку, Панаму, Калумбію, Эквадор, Перу, Бразілію, Балівію, Парагвай, Аргенціну ды Чылі.

Нясём мы не толькі зэдлікі, але і сваю культуру. Спяваем народныя песні, ставім вулічныя спектаклі. Кожная каманда — нібы культурныя паслы сваіх краінаў.

Прыкладна раз на паўтара месяца тры каманды сустракаюцца і ладзяць фестывалі. Фінальны пройдзе ў горадзе Ушуая на Агнявой Зямлі.



**Аўгіня Манцэвіч**

нар. у Вілейцы ў 1985. Журналістка, блогерка, пісьменніца. Пераможца конкурсу маладых літаратараў імя Уладзіміра Караткевіча ў 2005. Аўтарка кнігі «Графіка». Жыве ў Мінску. Дачка рэдактара «Рэгіянальнай газеты» Аляксандра Манцэвіча. Сястра журналісткі і паэткі Насты Манцэвіч.

**Верасень**

Нар. у Гомелі ў 1985. Скончыў Варшаўскі ўніверсітэт, факультэт геалогіі. Захапляецца фатаграфіяй. Меў персанальную выставу ў Нью–Ёрку. Муж Аўгіні Манцэвіч.

**Кірыла Краўцоў**

Нар. у Гомелі ў 1979. Фатограф. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту, факультэт эканомікі. Дырэктар «Дызайнерскай студыі Кірылы Краўцова» ў Гомелі.

## Нью-Ёрк, Таймс-сквер

Усе назбіраныя на падарожжа грошы мы вытрацілі на квіткі: прыляцелі ў ЗША па нулях. Я ўзяла ў рукі скрыпку і пайшла ў Таймс-сквер іграць. Такі спосаб зараблянне выявіўся карысным яшчэ і на цікавыя знаёмствы.

Джон і Том прадаюць Абама-, Маккейн- і Сара Пэйлін-прэзерватывы. Абама-прэзерватывы чорныя. Кожная дзяўчына з імі адчувае сябе першай ледзі, нават калі яна другая ці трэцяя. Ну а прэзерватывы Сара Пэйлін можна выкарыстоўваць некалькі разоў.

— Хочаш курнуць?

Я адрываюся ад кніжкі. Побач са мной, пазвоньваючы драбязою ў пластмасавай шклянцы, сядае хлопец год трыццаці.

— Не, — кажу, — дзякуй. Мне на скрыпцы граць.

Ён пацiснуў плячыма і пачаў забіваць касяк. У яго з сабой плакат з надпісам: «Дапамажыце! Мне трэба грошы на траву».

А як жа паліцыя?

— А яны нічога не могуць зрабіць, я закона не парушаю.

Юніверс, як назваў сябе маладзён, зарабляе каля 100 даляраў за пяць гадзінаў. Марыхуану купляе тут жа.

Праз пэўны час у Нью-Ёрку я прывыкла тлумачыць, што такое Беларусь, дзе яна знаходзіцца.

Зусім іншы досвед прынесла ігра на скрып-




Я паўдзельнічала у сапраўдным амерыканскім апазнанні — як у галівудскіх фільмах.




Былы дэсантнік Боб — адзіны белы ў чорным раёне.



Аламагорда — горад з ракетным палігонам.



Гэта не Докшыцы. Горад-прывід ля забытай Historic Rout 66.



У баптысцкім прытулку ў нас найперш запыталі пасведчанне ад шлюбе.



Фермер-пратэстант Рычард спявае нам песню пра канец свету. Яго жонка-індыянка так і не сказала ні слова.

цы на Брайтан-Біч. Штовечар па драўляным бордвоку на ўзбярэжжы Атлантычнага акіяна гуляюць адэскія яўрэі.

— Сыграй, каб душа спачатку развярнулася, а потым зноў звярнулася! Кшталту «Сіняе мора за кармою», — просіць мяне мужчына ў клятчастай кашулі.

Настальгію ў савецкіх людзей выклікала не толькі музыка. «Опа! Рабяты, вы рускія? — з радасным здзіўленнем падыходзіць да нас мужчына. — Я ўжо сто год табурэтак не бачыў».

**Нью-Ёрк**

найбольшы горад ЗША. Фінансавая сталіца свету. 8,4 млн жыхароў. Вялікі цэнтр беларускай дыяспары.

## Сапраўднае амерыканскае апазнанне

Скончыла грацць на скрыпцы на Юніён-сквер. Села — збіраю грошы, складаю скрыпку. Падымаю галаву — нада мною стаяць мужчына з жанчынай.

— Хочаце, каб я вам сыграла? — пытаю я.

— Не, — адказвае жанчына і паказвае мне паліцыйнае пасведчанне. — Я дэтэктыў Саліван. А вы падыходзіце пад апісанне злачынцы.

Я не ведаю, якім зрабіўся мой выраз твару, але дэтэктыў Саліван нават прытрымала мяне за локаць і дадала:

— Не хвалюйцеся, мы ўжо ведаем, што гэта не вы ўчынілі бойку, але нам трэба, каб вы прыехалі на апазнанне.

Паўдзельнічаць у сапраўдным амерыканскім апазнанні — як у галівудскіх фільмах! Калі ў адным пакоі садзяць некалькі чалавек, а ў іншым праз шкло злачынцу апазнае ахвяра! І вось мы ўжо едзем у паліцэйскім лімузіне. Усяго ў апазнанні павінна ўдзельнічаць пяць дзяўчат разам з падазраванай.

Прыехалі ў пастарунак. Нас завялі ў асобны пакой, перапісалі імя, прозвішча, узрост, вагу і рост. Кожнай з нас выдалі штосьці накшталт начнушкі і чэпчык на галаву.

Павялі ў пакой для апазнання. Там ужо сядзела злачынца — 19-гадовая татуяваная дзяўчына са злосным позіркам. Нас пасадзілі ў шэраг і далі ў рукі па паперцы з нумарам. Я трымала нумар «4». Падазраваная сядзела справа ад мяне з нумарам «3».

Дэтэктыў Ларэнса праінструктаваў нас. Калі з суседняга пакоя пагрукаюць у сценку, ён адвесіць акенца, якое мы бачым як люстэрка, мы павінны глядзець строга перад сабой, не ўсміхацца і не варушыцца. Пакуль з суседняга пакоя зноў не пагрукаюць і ён не зачыніць акенца. Чамусьці кожнай з нас на нос справа прыклеілі кавалак пластыру. Загадалі схаваць усе ўпрыгожанні, не паказваць пазногці, валасы...

Працэдура паўтарылася двойчы. Пасля ў пакой увайшла дэтэктыў Саліван і папрасіла першую, другую, чацвёртую і пятую на выхад. Мы распісаліся ў пратаколе, і нам выдалі па 20 баксаў.

Каб знайсці нелегальную працу, устаюць на ўзбочыне і стопяць машыны.

## Я тут адзіны белы сярод чорных

У невялічкім горадзе Стэмфард, штат Канектыкут, мы пабачылі цікавую карціну. Куча мексіканцаў стаіць на ўзбочыне і «стопіць» машыны. Толькі ехаць «стоперам» нікуды не трэба. Яны шукаюць працадаўцаў. Каму трэба — той ведае.

Колькасць нелегалаў у ЗША ад 1990 года вырасла ад 3,5 мільёна чалавек да 12 мільёнаў. Вясною штат Арызона прыняў закон, які дазваляе паліцыі затрымліваць любога чалавека, якога падазраюць у нелегальным знаходжанні ў ЗША.

Застацца тут мараць не толькі мексіканцы, але і шматлікія выхадцы з былога СССР. Нелегалы шукаюць для фіктыўнага шлюбу амерыканцаў. Іншы спосаб — палітычны прытулак. Грамадзянам «апошняй дыктатуры Еўропы» ў ім амаль не адмаўляюць.

...З Філадэльфіі амаль да трасы на Вашынгтон нас завёз чырвоны «Лінкальн». Амаль — гэта значыць яшчэ каля мілі пяшкарыць у 37-градусную спёку. Вось такіх нас, абвешаных усякай фігнёй, потных і абгарэлых, пабачыла 60-гадовая Эйн. «Скачыце ў машыну», — толькі і сказала яна.

Эйн у маладосці была хіпі, ездзіла па Штатах на старэнькім аўто. А цяпер падбірае кожнага аўтаспынніка. Яна — адна з нямногіх, хто так робіць. Аўтастоп тут амаль памёр. Людзі запужаныя тэлебачаннем, ніхто нікому не давярае. Да таго ж, працуе закон, адвакаты. І калі з намі штосьці здарыцца ў яе машыне, мы можам яе засудзіць.

...Нас высадзілі амаль у самім Вашынгтоне. Завечарэла. Я прапанавала папрасіцца на начлег да кагосьці. Аднак ніхто не адмыкаў. Мы ўжо было згубілі надзею, як у апошняй хаце пабачылі святло. Хата была маленькая, без плота, з непакошанаю травою ў двары.

Пасля доўгіх роспытаў дзверы нам расчыніў дзед з голым торсам у інвалідным вазку.

— Я тут адзіны белы і жыву даўно, таму мяне не чапаюць, — казаў нам Боб. — Але калі вы паставіце тут свой намёт, гэта будзе на свой страх і рызыку. І калі апосум ці мядзведзь на вас нападзе, я таксама невінаваты...

Перад нашай развітальнай песняй Боб адзеў майку і дастаў сваю электрычную гітару. Мы спявалі дзеду палескую песню XVI ст. «Зорачка», ён жарсна спрабаваў падыгрываць, а я ўсё касавурылася на «ствол», які вісеў у дзеда на сцяне.

Боб — былы дэсантнік. У доме — бардак і смурод. І гэты дзед тыцкае нам на развітанне 10 баксаў.

**Стэмфард**

невялікі горад у штаце Канектыкут. 120 тыс. жыхароў. Бум у ім пачаўся ў 1960—1970-я, калі багатыя карпарацыі сталі масава пераносіць свае сядзібы з Нью-Ёрка ў прыгарады.

## Нэшвіл, сталіца кантры

Пераседзеўшы дождж, мы выйшлі з «МакДональдса» ў надзеі злавіць яшчэ хоць адну машыну да ночы. Спыніўся пікап.

Кіроўца — red neck, «чырвоная патыліца». Так тут абразліва называюць мясцовых сялянаў — ад працы ў полі на сонцы ў іх шыі загарэлыя. Але ў Джошуа нават на кабіне з гонарам напісана — Рэднэк. Мы разам з заплечнікамі загрузіліся ў кузаў. Едзем міляў 90 у гадзіну, вецер здзімае з нас капелюшы, неба па-ранейшаму блішчыць маланкамі, мы ўцякаем ад хмараў.

Працяг на старонцы 12.

# Вялікія падарожнікі

Першай вядомай беларускай вандроўніцай можна лічыць княгіню Еўфрасінню Полацкую

Яна выправілася ў паломніцтва ў Іерусалім. У тыя часы гэта была найцяжэйшая задача. Вандравалі на драўляных чаўнах і пешшу. Дасягнуўшы мэты, захварэла і там памерла ў 1167.

**Ігнат Дамейка**

ураджэнец Мядзведкі (Карэліцкі раён). Удзельнічаў у антырасійскім паўстанні, мусіў бегчы з Беларусі ў 1830. Патрапіў ў Амерыку. Там стаў займацца навукай. Здзейсніў шэраг экспедыцый па Паўднёвай Амерыцы. Нацыянальны герой Чылі.

**Тур Хеердал**

нарвежскі вандроўнік, у 1947 на плыце «Кон-Цікі» пераплыў Ціхі акіян ад Перу ў заходнім кірунку. Падарожжа доўжылася 101 дзень. У 1970 на папірусным чоўне «Ра» пераплыў Атлантычны акіян.

**Юрый Сянкевіч**

расеец з беларускімі каранямі, разам з Хеердалам браў удзел у экспедыцыі 1970. Удзельнічаў таксама ў экспедыцыях па Індыйскім акіяне да Паўночнага полюса.

**Эрнэста Чэ Гевара**

у 1952 годзе цягам васьмі месяцаў разам з сябрам Альбертам Гранадам вандраваў у Паўднёвай Амерыцы. Пабывалі ў Чылі, Перу, Калумбіі, Венесуэле. У вандроўку адправіліся з Аргенціны на матацыкле, але пасля давялося ісці пешшу, ехаць цягнікамі.

**Юй Чуньшунь**

Кітаец, за восем гадоў ад 1988 у адзіночку абышоў увесь Кітай. У выніку ён пратупаў 40 тысяч кіламетраў.

**Фёдар Конюхаў**

Расеец, у 1990 за 72 сутак адзін дайшоў да Паўночнага полюса. А праз пяць гадоў за 59 дзён таксама ў адзіночку дабраўся да Паўднёвага полюса. Ён таксама тройчы здзейсніў кругасветныя водныя падарожжы.

КМ

# Аўтастопам ад Нью-Ёрка да мыса Горн. Частка I. ЗША

Працяг са старонкі 11.

Пакуль даехалі, зусім сцямнела. Намёт яшчэ сыры з мінулай ночы, і вось-вось зноў пачнецца навальніца. Тыповае надвор'е для поўдня Амерыкі. Гэта тут — радзіма тарнада.

Ідзём па прыдарожных гатэлях. Просім прытуліць на ноч, а за гэта можам выканаць любую працу: прыбраць нумары, вымыць падлогу, ды што заўгодна. Усе адмаўляюць. Толькі ў апошнім гатэлі дзяўчынка на рэцэпцыі падказала: ёсць дабрачынная арганізацыя, якая зможа нам дапамагчы. Набірае нумар.

Добры дзень, кажу я, маўляў, так і так, падарожнічаем з мужам, музыкі, звычайна спім у намёце, але намёт мокры яшчэ з мінулай ночы, а зараз зноў пачнецца навальніца, можа, зможаце чым дапамагчы. «Пачакайце, пераключу вас на сямейны аддзел», — пачула я ў адказ.

Жанчына ўважліва выслухала мяне і спытала, ці ёсць у нас з сабой пашпарты і пасведчанне пра шлюб. Пачуўшы станоўчы адказ, патлумачыла, куды ісці. Прыкладна за мілю ўжо ў поўнай цемры нас сустрэлі і прывялі ў баптысцкі сямейны прытулак.

**Тыповы амерыканскі горад непрыдатны для пешаходаў. Без машыны там жыць немагчыма.**

Праверылі дакументы, азнаёмілі з правіламі. Пад'ём а 7-й раніцы, сняданак а 8-й, абед а 2-й, вячэра а 6-й. Перад сном — абавязкова прымаць душ. Тэлефонам-аўтаматам карыстацца не больш за 5 хвілінаў у дзень. Пасля трох дзён жыцця ў прытулку задарма наступныя сем дзён мы мусім выконваць нейкія працы — напрыклад, прыбіраць у будынку, працаваць на ферме.

Але нам толькі на адну ноч, тлумачым мы. Нас угаворваюць застацца як мінімум на 3 дні, але мы настойваем на сваім, і нас вядуць у пакой з шыкоўным ложкам і душам.

Тут тры прытулкі: сямейны, для мужчынаў і для жанчынаў. Іх жыхары — у асноўным бяздомныя альбо тыя, хто пасварыўся з сям'ёй і не мае дзе прытуліцца. Наступнага дня пасля сняданку мы далі невялікі канцэрт мясцовым жыхарам. На развітанне яны памаліліся за нас, сказалі, што чакаюць яшчэ, і мы рушылі ў шлях.

Спыняцца ў Нэшвіле — сталіцы музыкі стылю кантры — наваt не збіраліся. Але наш спадарожнік Марк так расхваліў гэты горад, што мы вырашаем хаця б на пару гадзінак заехаць туды. Тым больш што траса — усяго за мілю ад цэнтра.

Нэшвіл аказаўся даволі сумным. Цэнтр — забава для турыстаў. Свет сувенірных крамаў і бараў з жывою музыкаю. У кожным з іх — сцэна, дзе граюць кантры. У адным з такіх бараў мы разрулілі выступ і для сябе. Сагналі са сцэны дзядзьку, які брынькаў кантры, і залабалі некалькі беларускіх народных песень.

**Нэшвіл**

сталіца штата Тэнэсі. 640 тыс. жыхароў. Залатым векам Нэшвіла было XIX ст. Пасля паразы Поўдня горад праспаў цэлае стагоддзе аж да часоў новага эканамічнага буму ў 1970-я. У Нэшвіле нарадзілася музыка кантры, што робіць горад вялікай турыстычнай атракцыяй для амерыканцаў.

## І лекцыя пра канец свету

Цяпер — у Мемфіс. Нас падвозіў будаўнік Патрык, інжынер Майкл і фермер-пратэстант Рычард з дзікункай-жонкай Хэйзл. На пятай хвіліне нашага знаёмства Рычард прапанаваў пераначаваць у іх з Хэйзл на ферме. Мы было ўжо згадзіліся, але наступную гадзіну Рычард апантана расказваў пра канец свету, а ягоная жонка — з выгляду індыянка — так і не раскрыла рота. Крыху пабойваючыся гэтай парачкі, мы сказалі, што нас чакаюць у Мемфісе і мусім ехаць далей. На развітанне Рычард спеў нам уласную песню пра канец свету.

Наступным спыніўся індус Алі. Клёвы чувак, уладальнік запраўкі «Брытыш петроліум».

Мемфіс выявіўся яшчэ больш сумным горадам, чым Нэшвіл. Да таго ж, непрыдатным для пешаходаў. Тыповы амерыканскі горад — без машыны там жыць немагчыма. Грамадскага транспарту амаль няма, а адлегласці велічэзныя. Пагуляўшы па радзіме Элвіса Прэслі, мы вырашылі да вечара пакінуць яе.

**Мемфіс**

горад у штаце Тэнэсі. 680 тыс. жыхароў. Цэнтр рэгіёна вырошчвання бавоўны. У Мемфісе быў забіты Марцін Лютэр Кінг. Гэта здарылася 4 красавіка 1968 у матэлі, гэта значыць танным гатэлі Lorraine Motel. Ён загінуў праз дзень пасля сваёй прароцкай прамовы «Я быў на вяршыні гары», з якой ён выступіў у масонскім храме Мемфіса, што змяшчае, дарэчы, аж 4891 чалавека. Масонства застаецца масавым рухам у правінцыйнай Амерыцы. На поўдні краіны застаюцца моцнымі і расавыя супярэчнасці між белымі і чорнымі, у абарону правоў якіх і выступіў Марцін Лютэр Кінг.

## Historic Rout 66

Шлях ад Мемфіса да Лос-Анджэлеса (дзве тысячы міляў) мы пераадолелі ўсяго за трое сутак. Праехалі ўжо больш за тысячу міляў з Нью-Ёрка да Мемфіса і яшчэ ні разу не ездзілі на знакамітых амерыканскіх траках. «Бэн, ай нід хэлп», — сказала я, і нам тут жа спыніўся грузавік.

За трое сутак у дарозе мы памянялі тры гадзіннікавыя паясы — Амерыка вялізная краіна. Мы пабачылі, як мяняецца прырода: ад дрэваў да кустоў, ад кустоў да кактусаў, ад кактусаў да самай пустыні.

Некалькі разоў давялося начаваць на стаянках грузавікоў — трак-стопах. Там усё зроблена для дальнабояў — душы, пральні, тэнісныя корты, спартзалы і капліччкі.

Многія дальнабоі падарожнічаюць з жанчынамі або сабакамі. «А хто ездзіць без жанчыны і без сабакі, — той підар», — сказаў нам Бэн, кіроўца даўжэзнага, імпануючага Western Star'a.

Найбольшы ў ЗША штат — Тэхас. На ўсім шляху праз яго нас суправаджае пах нафты. На кожным кроку тут стаяць помпы.

Часта па дарозе трапляюцца гарады-прывіды. Асабліва іх шмат уздоўж гістарычнай трасы 66 — першага ў свеце хайвэю. У 20-х гадах XX ст. гэтая дарога злучыла усход і захад Штатаў, працягнуўшыся праз 4000 кіламетраў. Траса была піянерам прыдарожнай культуры. Каля яе ўпершыню з'явіліся запраўкі, матэлі. У пачатку 80-х дарогу канчаткова закрылі — з'явілася шмат іншых, лепшых. І знакамітая Historic Rout 66 перастала карыстацца папулярнасцю. А ўсе прыдарожныя ўстановы закрыліся. Гэтыя маленькія гарадкі і называюць гарадамі-прывідамі.

Ура, мы ў Эль-Паса! Адкуль усяго гадзіна да Альбукерке, дзе ў нас умоўлены першы фестываль. І маем зэканомленыя дні, каб паехаць у Лос-Анджэлес.

Калі ў Мінску 12.00, у Лос-Анджэлесе — 2.00.

Над Лос-Анджэлесам вісіць смог, бо горад ляжыць у катлавіне. Затое дзякуючы гарам у ЛА тэмпература на градусаў 15 меншая, чым у Тэхасе ці Арызоне. Проста рай: 25 замест 40.

## Дзіна з «Вікадзінам»

...Галасуем на шляху да Альбукерке. Спыніўся сівы дзядзька на разламанай машыне без бакавога шкла.

— У вас ёсць з сабой нож? — пытаецца ён.

— Пакуль няма, — кажам.

— Даць?

Так мы пазнаёміліся з Дзіна.

Ён ездзіць за 230 км з Нідлса ў Барстоў па бясплатны «Вікадзін». Дзіна, удзельнік в'етнамскай вайны, лекі прапісаныя бясплатна. Ён сядзіць на дзяржаўнай дапамозе. Грошай ледзь хапае на жыццё. Каб неяк прытрымацца, збірае бутэлькі. За кожную — 5 цэнтаў.

Яшчэ адзін спосаб — прадаваць «Вікадзін». Кожная таблетка — два даляры. У яго гарадку амаль кожны першы наркаман, кажа Дзіна. Не выключэнне і ягоная былая дзяўчына Стэфані. Ужо некалькі год яна сядзіць у турме.

«Я зарабляю грошы, яна іх марнавала. Хлусіла, крала. Яна вельмі добрая жанчына... гэта ўсё наркотыкі...»



**Лос-Анджэлес. Хмарачосы сярод мора малапавярховай Амерыкі.**

## А посуд дома пластыкавы

А да мексіканскай мяжы нас давёз Шон. У яго ўся сям'я — вайскоўцы. Шон быў у Іраку, Кувейце. Што там рабіў — сакрэт.

Кажа, тэмпература ў Іраку бывае такая, што ежу смажыць не трэба — паклаў на сонца на 20 хвілінаў — і гатова. 63 градусы. Таму пустыня Нью-Мексіка, дзе ён нас злавіў, для яго — кветачкі.

Мінаем «Агнявую даліну». Тут калісьці вывяргаўся вулкан і цяпер усё пакрыта лаваю. Недалёка ад гэтага месца ў 1945 годзе ўпершыню выпрабавалі атамную зброю. Сёння там вялізная варонка, а ўздоўж дарогі прадаюць сплаў, які застаўся пасля выбуху бомбы «Трыніці». А яшчэ раней у гэтых мясцінах хаваўся забойца Білі Кід — адзін з сімвалаў Дзікага Захаду.

Аламагорда — вайсковы гарадок на 35 тысячаў жыхароў. Небагаты. Многія жывуць у вагончыках, маюць гароды. Вось і Шон дастаў з травы пару кабачкоў цукіні ды прыгатаваў нам вячэру. Смачную. Ён, дарэчы, прафесійны кухар — гатуе ў мясцовым шпіталі. А ў вольны час ён пажарнік-добраахвотнік. Рэальна трэба.

Дома ў Шона пластыкавы посуд, а замест кубкаў — паўлітровыя слоікі.

І гэта таксама Амерыка, і гэта таксама тыповы амерыканец.

**Паводле euroradio.by**

**Альбукерке**

найбольшы горад штата Нью-Мексіка. 530 тыс. жыхароў. Належыць да ліку амерыканскіх гарадоў, якія інтэнсіўна растуць, у тым ліку дзякуючы напльву імігрантаў з Мексікі і Цэнтральнай Амерыкі. Насельніцтва горада вырасла з 2000 да 2010 на 100 тыс. чалавек. Для параўнання: насельніцтва Гомеля за той час вырасла на 5 тыс. чалавек.

Працяг будзе.

**Rout 66**

аўтамагістраль ад Чыкага на поўначы да Лос-Анджэлеса на паўднёвым захадзе. 3940 км удоўжкі. Адкрыта ў 1926 годзе ў рамках нацыянальнай праграмы будаўніцтва аўтадарог.

**Амерыканская міля — 1,6 км.**

Адлегласць між Нью-Ёркам і Лос-Анджэлесам крыху больш за 4900 кіламетраў (нашым шляхам).

**ЗША — найбагацейшая краіна свету**

Плошча — 9827 тыс. кв. км — амаль у 20 разоў большая, чым Беларусі. Насельніцтва — 310 млн чалавек. Амаль у 33 разы большае, чым у Беларусі. Краіна складаецца з падобных да Еўропы лясістых раёнаў усходу і поўначы, гарачага поўдня, высокіх гораў і пустыняў на захадзе і паўднёвым захадзе. Надзвычай разнастайная краіна, стракатае насельніцтва якой яднае дэмакратычная палітычная культура, заснаваная на свабодзе індывіда і аўтаноміі прыватнай уласнасці, узведзеных у абсалют.




**Нас падвозіў Вальдэк з Таронта, канадскі дальнабой, родам паляк.**

# Метрычную кнігу Ішкальдскага касцёла выкупілі

Збор сродкаў на яе арганізаваў студэнт **Андрэй Радкоў**.








У № 44 «НН» пісала пра тое, што на інтэрнэт-аўкцыён ay.by выстаўлены ўнікальны даумент — метрычная кніга з найстарэйшага ў Беларусі касцёла — Ішкальдскага. У кнізе зафіксаваныя звесткі пра народжаных у парафіі ад 1759 да 1807 года. Уласнік-калекцыянер у пачатку 1990-х выкупіў гэту кнігу ў нашчадкаў, што знайшлі яе на бабуліным гарышчы. За ёмісты том ён выставіў цану ў тры мільёны рублёў, аднак ніхто не захацеў яе набыць. Між тым, звесткі кнігі могуць уяўляць навуковую каштоўнасць. Так, пробашч каталіцкай парафіі ў мінскай Серабранцы а. Ігар Лашук лічыць, што ў ёй можа быць і запіс пра хрост Ігната Дамейкі.

Студэнт гістарычнага факультэта БДУ Андрэй Радкоў адчыніў рахунак у банку і арганізаваў збор сродкаў на кнігу. Менш чым за тыдзень былі сабраныя неабходныя грошы. «Ахвяравалі розныя сумы, нехта болей, нехта меней. Нават па тысячы, па тры тысячы некаторыя», — кажа А.Радкоў.

Адным з ахвярадаўцаў стаў пасол Францыі ў Беларусі Мішэль Рэнеры — ён даў на выкуп кнігі цэлы мільён.

4 снежня ініцыятары перадалі грошы прадаўцу і прывезлі кнігу ў Мінск. Пры першым аглядзе цяжка вызначыць, ці ёсць там звесткі пра Дамейку: почырк тагачасных святароў не ўсюды разборлівы. Тым больш, што хрысціць нашага земляка, які стаў нацыянальным героем Чылі, маглі не ў ліпені, калі ён нарадзіўся, а любым іншым наступным месяцы. Таму тут працы не на пяць хвілін.

Цяпер Метрычную кнігу пакінуць у Мінску, каб зрабіць лічбавую копію для даследчыкаў. Таварыства аховы помнікаў будзе дабівацца, каб кнізе надалі статус рухомай матэрыяльнай каштоўнасці — тады яе немагчыма будзе ўпотай прадаць ці вывезці за мяжу.

Пасля зняцця копій кнігу прапануюць вярнуць на захаванне ў Ішкальдскі прыход.

**Сяргей Макарэвіч**

## Памерла Вольга Самусік

7 снежня не стала рок-спявачкі і журналісткі Вольгі Самусік, вакалісткі гуртоў «Zygimont Vaza» і «Тарпач». Прычынай смерці быў панкрэатыт. Дзяўчына перанесла шэраг аперацый.

**ЗП**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Вольга на «Рок-каранацыі» 2007 г., якую выйграла ў намінацыі «Рок-князёўна».**

## «Беларускае замежжа» без Арсенневай і Сурвілы

У Мінску прэзентавалі кнігу «Беларускае замежжа». Ініцыятарка праекта — працаўніца апарата Савета міністраў, кандыдат гістарычных навук Наталля Голубева. Сярод аўтараў кнігі — даследчыкі эміграцыі Адам Мальдзіс, Мікола Нікалаеў, Наталля і Алег Гардзіенкі, Лявон Юрэвіч. У кнізе, дзе сцісла распавядаецца аб славутых беларусах замежжа, не згаданая паэтка Наталля Арсенева. Аўтар артыкула пра беларусаў ЗША, Алег Гардзіенка, сведчыць, што імя Арсенневай стаяла там першым. Таксама, паводле яго словаў, з кнігі выкраслілі імя Старшыні Рады БНР Івонкі Сурвілы.

«Мы нікога не выкрэслівалі, — заявіла Наталля Голубева карэспандэнту «НН». — Мы ставілі нават Геніюш». Складальніца кажа, што гэта магла быць выпадковасць. Але няма якраз імёнаў, якія ўвасабляюць несавецкі шлях развіцця беларускай нацыі. Некалькі гадоў таму Мінадукацыі выкінула вершы Арсенневай са школьных праграм.

Зрэшты, пэўны ідэалагічна-цэнзурны прагрэс назіраецца: у выданне трапіла «нават» адна з найлепшых беларускіх паэтак, сакратар Рады БНР Ларыса Геніюш.

**Кастусь Матушыч**

## У навеле Караткевіча цэнзар зрабіў 296 правак

Выйшла «Ладдзя Роспачы» ў арыгінальным выглядзе аўтарскага рукапісу.

Цяпер чытачы маюць магчымасць пабачыць на ўласныя вочы ўсе цэнзарскія, аўтарскія і карэктарскія праўкі, зробленыя ў навеле, калі яе рыхтавалі да друку. Толькі цэнзарскіх правак назбіралася 296. Ідэя такога выдання, што дэманструе нам рэальнасць савецкае таталітарнае сістэмы і паказвае ўвесь творчы працэс навывварат, належыць Глебу Лабадзенку, літаратару і журналісту.

У кнізе пададзеныя тры варыянты навелы Караткевіча. Апроч саміх копіяў старонак Караткевічавага рукапісу, у кнізе ёсць 55 ілюстрацый, 27 з якіх друкуюцца ўпершыню, шматлікія фотаздымкі з ягонага сямейнага архіву і збораў сяброў, якіх яшчэ не бачыла шырокая публіка.

Рыгор Барадулін напісаў прадмову да выдання. Бо менавіта сябру Барадуліну ў 1964 годзе і прысвяціў сваю навелу «Ладдзя Роспачы» Караткевіч. У выданні ёсць фотакопія рукапісу, потым ідзе кніжны тэкст з праўкамі Караткевіча і цэнзара.

Ідэя ўзнікла ў Глеба Лабадзенкі, калі ён дазнаўся, што ў Васіля Сёмухі ёсць арыгінальны машынапіс аповесці Караткевіча, з якога ён рабіў пераклад на расійскую мову для часопіса «Нёман». У параўнанні з тагачаснай публікацыяй у часопісе Глеб Лабадзенка налічыў 153 цэнзарска-рэдактарскія праўкі! Пасля ўкладальнік выявіў у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа чарнавыя накіды «Ладдзі» — чатыры рукапісныя аркушы. Яны таксама ўключаныя ў кнігу. Завяршаецца кніга аналізам правак, зробленых у творы падчас яго рэдагавання.

Перад намі паўстае амаль дэтэктыўная гісторыя змагання Майстра з цэнзураю. Кніга надзвычай важная не толькі для гісторыкаў літаратуры і філолагаў, але і для ўсіх, хто хоча адчуць дух таго часу. Якія ж праўкі рабіліся? Словы Смерці, звернутыя да Гервасія Вылівахі «Больш за ўсё я не люблю прыходзіць за беларусамі» рэдактар змяніў на «Больш за ўсё я не люблю прыходзіць па такіх, як ты...». І нават «беларускія жаўрукі» зрабілся пасля рэдактуры проста «жаўрукамі»...

Прэзентацыя «Ладдзі Роспачы» прайшла з аншлагам: не ўсе ахвотныя змясціліся ў мінскі «Кніжны салон» на вуліцы Калініна, 13. Імпрэза была інтэрактыўная: у салоне стаяў экран, на якім можна было пабачыць фрагменты тэксту, фота з кнігі. Удзел узялі Васіль Сёмуха і Рыгор Барадулін, Уладзімір Арлоў і Лявон Вольскі, які заспявалі песню на верш Караткевіча.



**Караткевіч Уладзімір. Ладдзя Роспачы.** Навела / Першае непадцэнзурнае выданне: аналіз аўтарскіх і цэнзарска–рэдактарскіх правак. Уклад., ідэя, камент., аналіз Глеба Лабадзенкі; прадмова Рыгора Барадуліна ; паслямова Васіля Сёмухі. — Мінск : Медысонт, 2010. — 148 с.

**Сяргей Харэўскі**

## Сцісла

• **Помнік Скарыну ў Вільні — рэальна, Караткевічу ў Мінску — перспектыва далёкая.** Павел Латушка паабяцаў ва ўсіх суседніх краінах паставіць помнікі вядомым беларусам, адказваючы на пытанні «гарачай лініі» ў рэдакцыі газеты «Культура». Міністр адзначыў, што ў Кіеве помнік Караткевічу з'явіцца да 20 снежня. Наконт помніка пісьменніку ў Мінску ён адказаў, «што гэта пытанне больш далёкай перспектывы. Таксама ідуць перамовы пра ўсталяванне помніка Скарыну ў Вільні.

• **Прыязджаў Myslovitz.** Канцэрт каманды, папулярнай у Еўрасаюзе, прайшоў у мінскім «Рэактары». Польскі гурт выступіў у межах праекта «Жывы гук On-line». Гэты праект стварыў Піт Паўлаў, каб адкрываць публіцы маладыя гурты. Прыезд легенды польскага року арганізаваў Польскі інстытут у Мінску. Таму квіткі былі таннымі.

**КМ**

## Галоўным рэжысёрам Музычнага тэатра стала грамадзянка Расіі

Сусанна Цырук прызначаная галоўным рэжысёрам Музычнага тэатра. Гэтай падзеі чакалі, чуткі пра яе хадзілі даўно, але падпісанне кантракта адбылося толькі 3 снежня.

Сп-ня Цырук нарадзілася ў Мінску ў высокаінтэлігентнай сям'і, якая прыехала з Ленінграда «падымаць культуру» (бацька — вядомы дырыжор, маці — піяністка). Скончыла Ленінградскую кансерваторыю, нейкі час працавала ў Мінску, але з'ехала ў Расію амаль адначасова з Пінігіным і Марголіным. Разам з імі атрымала расійскае грамадзянства і, вярнуўшыся ў Мінск, не хоча яго губляць. Бо гэтае вяртанне — не з нейкіх там сентыментальных нагодаў, а проста таму, што ў Беларусі на рэжысёраў ёсць попыт. У Расіі гэткага попыту няма.

У Музычнага тэатра ў запрашэнні сп-ні Цырук свой інтарэс. Там спадзяюцца, што рэжысёр з досведам працы на найлепшых пляцоўках свету выведзе калектыў на новы ўзровень канкурэнтнасці і прафесіяналізму. Пэўна, так і будзе. Важна пры гэтым, каб не страцілася галоўная адметнасць беларускага тэатра — яго душэўнасць.

**Юлія Андрэева**




## СПОРТ

### Баскетбол

**1 снежня (субота) у «Мінск-Арэне»** — баскетбол. У спаборніцтве аб'яднанай лігі ВТБ сустрэнуцца «Мінск-2006» — ЦСКА (Масква). **Пачатак а 19-й.** Білеты да 20000 рублёў.

## КАНЦЭРТЫ

### Калядны вечар з Моцартам

**18 снежня а 19-й у Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20)** пачнецца канцэртная праграма Аляксандра Анісімава «Калядны вечар з Моцартам». У канцэрце бяруць удзел **камерны склад Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра**, дырыжор **Ігар Бухвалаў** і саліст **Джакома Батарына** (фартэпіяна).

### Вандроўка на радзіму The Beatles

**11 снежня ў Маладзёжным тэатры эстрады (вул.Маскоўская, 18а)** адбудзецца прэм'ера канцэртнай праграмы «Падарожжа на радзіму The Beatles. Зайграюць **Flat**, **The Apples** і ВІА **«Зодчыя»**. Тры выканаўцы, тры пакаленні музыкаў: самавітыя дзядзечкі з «Зодчых», якія праславіліся на ўвесь Савецкі Саюз яшчэ ў пачатку 70-х, зусім юныя хлопцы з The Apples і музыканты Flat, ужо не маладыя, але яшчэ і не «дзядзечкі» з жыватамі. Трыццаць хітоў The Beatles плюс 10-хвілінны дакументальны фільм «Flat» у Ліверпулі».




**«J:морс»**

**11 снежня а 19-й у Палацы спорту** — канцэрт «J:морс» «Электрычнасць».

## ВЫСТАВЫ

### Дзень нараджэнння Багдановіча

**9 снежня Літаратурны музей Максіма Багдановіча (вул. Багдановіча, 7а)** запрашае ўзяць удзел у мерапрыемствах, прымеркаваных да дня нараджэння Максіма Багдановіча. **А 12-й** — урачыстае ўскладанне кветак да помніка Максіму Багдановічу. **А 16-й** — літаратурна-музычная імпрэза «Светлыя згадкі...» з удзелам вядомых беларускіх пісьменнікаў і музыкаў. 9 снежня для ўсіх прыхільнікаў таленту вялікага паэта прапануецца вольнае наведванне экспазіцыі Літаратурнага музея М.Багдановіча, **філіяла музея «Фальварак Ракуцёўшчына» (в. Ракуцёўшчына, Маладзечанскі р-н)**.



### Вернутыя імгненні. Яўрэі царскай Расіі

**Да 16 снежня ў Гістарычным музеі (вул.Маркса, 12)** працуе выстава «Вернутыя імгненні. Яўрэі царскай Расіі». На выставе можна ўбачыць фоты з калекцыі Расійскага этнаграфічнага музея, а таксама рарытэтныя рэчы сакральнага і побытавага прызначэння традыцыйнай яўрэйскай культуры з калекцый Гістарычнага музея Беларусі.

### Кола агню

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47) да 25 снежня** працуе выстава «Кола агню» па выніках VIII Міжнароднага пленэра «Арт-Жыжаль». У пленэры бяруць удзел прадстаўнікі Беларусі, Венесуэлы, Германіі, Літвы, Малдовы, Расіі, Украіны.

### Прагулкі па Парыжу

**У Мастацкім музеі да 8 лютага** працуе выстава твораў беларускай мастачкі Ірыны Котавай «Прагулкі па Парыжу». У экспазіцыі прадстаўленыя больш за 40 твораў мастачкі, выкананыя ў тэхніцы пастэлі.

### Казкі новай зімы

**Літаратурны музей Максіма Багдановіча (Багдановіча, 7а) запрашае з 10 па 12 снежня з 15-й да 19-й** на святочныя майстар-класы «Казкі новай зімы». На майстар-класах будуць прадстаўлены як традыцыйныя віды дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, так і сучасная гарадская хэнд-мэйд культура. Кожны зможа выбраць сабе занятак даспадобы... Праграма: **10 снежня.** Дзень першы. Казкі ад бабулі. 15.00 — урачыстае адкрыццё; 15.10 — 19.00 — майстар-класы па традыцыйных відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. **11 снежня.** Дзень другі. Сяброўчына казка. 15.00 — 19.00 — майстар-класы па сучасным hand-made мастацтве. **12 снежня.** Дзень трэці. Твая казка. 15.00 — 19.00 — майстар-класы. Кірмаш; 19.30 — 21.00 — рок-катрынка. Выступы моладзевых рок-гуртоў.

### Барыс Забораў

**10 снежня ў Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20)** завяршаецца выстава 38 твораў жывапісу і скульптуры Барыса Заборава. Мастак нарадзіўся ў Мінску ў 1935-м, ад 1981 ён жыве ў Парыжы. Яго называюць беларускім мастаком, а сам Забораў лічыць сябе грамадзянінам сусвету, радзіма якога — Беларусь.

### Юдаль Пэн у Мінску

**У Музеі Якуба Коласа (вул. Акадэмічная, 5) да 21 снежня** працуе выстава партрэтаў і краявідаў Юдаля Пэна. У экспазіцыі — 23 працы майстра з калекцыі Віцебскага краязнаўчага музея. Акрамя таго, дэманструюцца 40 паштовак з краявідамі Віцебска пачатку XX стагоддзя.

## ТЭАТРЫ

**8 снежня**

**Зніч** — «Пачакай, сонца!»
**Беларускай драматургіі** — «Жан і Беатрыса»
**Оперы і балета** — «Кармен»
**Купалаўскі** (Малая сцэна) — «Востраў Сахалін»
**Купалаўскі** — «Памінальная малітва»

**9 снежня**

**Зніч** — «У краіне светлай...»
**Лялек** — «Марынка-крапіўніца»
**Беларускай драматургіі** — «Сталіца Эраўнд»
**Оперы і балета** — «Тоска»

**10 снежня**

**Беларускай драматургіі** — «Неба ў дыяментах»
**Лялек** — «Драй швестэрн» (для дарослых)
**Оперы і балета** — «Травіята»

**11 снежня**

**Лялек** — «Кот у ботах»
**Оперы і балета** — «Севільскі цырульнік»
**Беларускай драматургіі** — «Нязваны госць»

**12 снежня**

**Лялек** — «Васіліса Прыўкрасная»
**Беларускай драматургіі** — «Чайка»
**Оперы і балета** — гала-канцэрт зорак сусветнай оперы

**13 снежня**

**Беларускай драматургіі** — «Мужчыны на грані нервовага зрыву»
**Купалаўскі** (Малая сцэна) — «Беларусь у фантастычных апавяданнях»
**Купалаўскі** — «Translations»

**14 снежня**

**Горкага** — «Валянцінаў дзень»
**Оперы і балета** — «Рамэа і Джульета»
**Беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»

## КІНО

# Бландзінкам спадабаецца

**Рапунцэль: Заблытаная гісторыя** (Tangled)
ЗША, 2010, каляровы, 3D, 100 хв.
**Рэжысёры:** Натан Грэна, Байран Гоўард
**Жанр:** Анімацыйная музычная казка для ўсёй сям'і
**Адзнака:** 6 (з 10)




Прыгажуня Рапунцэль з чароўнымі доўгімі валасамі нудзіцца, замкнутая ў высокай вежы. Гераіня і не падазрае, што яна — прынцэса, выкрадзеная інтрыганкай, якая толькі выдае сябе за яе матулю.

Але аднойчы ў вежу трапляе злодзей Флін, які сцягнуў у палацы карону прынцэсы. Рапунцэль бярэ Фліна ў палон дый адпраўляецца з ім у вялікі свет. Па слядах уцекачоў ідзе злая старая, конь-шныпар Максімус дый бандыты-прыдуркі.

Юбілейны, 50-ы па ліку, поўнаметражны мульфільм Дыснэеўскай студыі — гэта звыклыя анімацыйныя прыгоды са смехам і спевамі. Разбойнікі выводзяць пяшчотныя рулады пра свае мары, прынцэса махае баявою патэльняй, конь-нюхач дый свойскі хамелеон пацяшаюць публіку.

Але сучасная казка сплецена пажаночаму. Мужчыны ва ўсім саступаюць жанчынам. Жанчыны плятуць інтрыгі, звіваюць ласо, ажыўляюць і лекуюць. Сплеценыя валасы — гэта ўвогуле асобная тэма. Для анімацыі валасоў няўрымслівае бландзінкі выкарыстоўвалася асобная праграма, па якой нават была абароненая дысертацыя.

Валасы ліюцца, лётаюць, ззяюць. Але самыя пекныя кадры карціны — рэкамендую ў 3D — тысячы і тысячы агеньчыкаў. Гэты карнавал святла апраўдвае і прадказальны сюжэт і нехарызматычны расійскамоўны дубляж.

**Андрэй Расінскі**

ДЛЯ ЭКСТРЭМАЛАЎ

# Егіпецкіх акулаў беларусы не баяцца

Нядаўнія напады акулаў на расіян і ўкраінцаў у Егіпце не адбіліся на актыўнасці беларускіх турыстаў, канстатуюць у турыстычных кампаніях Беларусі. Туры ў Егіпет ужо раскупленыя на тыдні наперад.

На думку дырэктара турыстычнай кампаніі «4 бакі свету» Алены Юхневіч, ведаючы аб такой небяспецы, людзі, якія едуць адпачываць, часцей за ўсё думаюць, што якраз на іх акулы і не нападуць. «Гарачае жаданне адпачыць у цёплай краіне, калі ў нас такі холад, — яшчэ адна падстава не адмаўляцца ад тура», — адзначыла дырэктар туркампаніі.

Менеджар кампаніі «Лэндтур» Дзіна Кароль заўважыла, што беларусы рэдка адмаўляюцца ад таго, што запланавалі. «Нават калі ў Тайландзе былі ваенныя дзеянні, кліенты проста махалі рукамі: маўляў, падумаеш, усё роўна паедзем», — гаворыць яна.

1 снежня ад нападу акулы каля берагоў егіпецкага курортнага горада Шарм-эль-Шэйх сур'ёзна пацярпелі трое грамадзян Расіі (дзве жанчыны і мужчына) і грамадзянін Украіны. Пасля гэтага грамадскія пляжы ў некаторых зонах горада былі закрытыя да асаблівага распараджэння паліцыі. Паводле апошняй інфармацыі замежных СМІ, у Шарм-эль-Шэйху злавілі акулу, якая напала на турыстаў. На працягу двух сутак на яе палявалі 12 спецыялістаў.

Папярэдні выпадак нападу акулы на чалавека ў Егіпце быў у чэрвені 2009 года. Тады смерць чалавека ў выніку нападу акулы была зафіксавана ў Егіпце ўпершыню з 2004 года.

**БелаПАН**

# Чаму гараць аўтамабілі

Снегапады тут ні пры чым, мяркуюць спецыялісты з СТА.

За апошні тыдзень у Мінску згарэлі чатыры аўто. Прычым выглядала гэта як «аўтамабільнае самаспаленне» — заўважных знешніх прычын для пажару не было.

На вуліцы Каменнагорскай палыхнуў маторны адсек Citroen C5. Абгарэлі лабавое шкло, колы, капот, бампер, фары. На вуліцы Козыраўскай успыхнуў Peugeot 307 — агонь таксама ішоў з маторнага адсека. Агонь дабраўся аж да салона. На тэрыторыі СТА па вуліцы Аўтамабілістаў загарэлася Mazda MPV, маторны адсек цалкам выгараў, паведамляе «Камсамольская праўда».

Спецыялісты МНС вызначылі прычыну ўзгаранняў: кароткае замыканне электраправодкі. Гэта магло адбыцца з-за снегападаў, якія пачаліся акурат на мінулым тыдні, мяркуюць у МНС. Снег трапляе пад капот, і вільгаць пры сутыкненні з сапсаванай праводкай правакуе кароткае замыканне.

Аднак гэтай версіі супярэчаць вядомыя выпадкі, калі машына загараецца ў сухім гаражы і згарае разам з ім.

Спецыялісты некалькіх СТА, да якіх звярнуўся карэспандэнт «НН», версію наконт снегападаў лічаць няслушнай. «Надвор'е не ўплывае на такія рэчы, — адказалі нам на СТА Minsk-auto. — Тут толькі адна нагода — сапсаваная праводка. Такое самае ўзгаранне можа здарыцца і летам, і восенню. І без вільгаці кароткае замыканне — звычайная справа, калі праводка сцерлася да дзірак».

Ці маюць нейкія пэўныя маркі аўто «схільнасць» да самаўзгарання? Спецыяліст мяркуе, што не: «Ад маркі не залежыць — любыя новыя аўто гараць рэдка». Каб засцерагчыся ад нечаканага аўтапажару, трэба проста рэгулярна правяраць машыну, глядзець, ці не патрэскалася ізаляцыя на дратах электраабсталявання. Калі ж праводка знаходзіцца ў «недасяжных месцах», і на вока яе стан не вызначыш — значыцца, трэба рэгулярна правяраць аўтамабіль на СТА.

**Юрась Ускоў**




**Гэты «Опель Вектра» ўспыхнуў на праспекце Незалежнасці 1 снежня. МНС мяркуе, што пажар пачаўся з багажніка, дзе знаходзіўся газавы балон.**

**Калі дрот іскрыць**

Драты электраабсталявання, сабраныя пукі, труцца аб корпус і адзін аб адзін. Калі заўважылі, што адзін з дратоў выскачыў з пука, вярніце яго на месца. Калі дрот іскрыць — абрэжце яго на некалькі сантыметраў вышэй і ніжэй за пашкоджанае месца, зрабіце ўстаўку з запаснога дроту, заізалюйце месцы злучэнняў ізаляцыйнай стужкай (не скотчам). Абавязкова пакажыце аўто прафесійнаму электрыку.

**Іншыя магчымыя прычыны ўзгарання аўто**

– выкарыстанне адкрытага агню для разагрэву замерзлага рухавіка;

– «прыкурванне» акумулятара;

– залішняя нагрузка на электраправодку з-за няякаснага мантажу дадатковага абсталявання (сігналізацыя, процітуманныя фары, магнітола, цюнінг салона і да т.п.);

– генератар няспраўны і змешчаны ля паліўнай помпы;

– стары глушыцель адарваўся падчас руху і пашкодзіў бензабак;

– няспраўнасць сістэмы круіз-кантролю;

– падаграюцца фарсункі абмывальніка шкла;

– паліўныя шлангі парваліся, і паліва трапіла на гарачы калектар;

– награецца катушка запальвання пры працяглым уключэнні непрацуючага рухавіка.

**Аўтааматары рэкамендуюць**

сачыць за чысцінёй падкапотнай прасторы і асабліва за ізаляцыяй праводкі. Звярніце ўвагу: калі пры выхадзе з машыны ад дзвярэй б'е токам, у вашым аўто нешта не так!




# Абраныя імёны талісманаў Еўра-2012

У Кіеве агучаныя вынікі інтэрнэт-галасавання аб імёнах блізнятаў-талісманаў чэмпіянату Еўропы па футболе, які пройдзе ў 2012 г. у Польшчы і Украіне. 56% інтэрнэт-карыстальнікаў прагаласавалі за варыянт Славэк і Славко. За варыянт «Сімка/Стрымко» прагаласавалі — 29%, за Клемэка/Ладко — 15%.

# Цырк вярнуўся

Адчыніўся пасля рамонту Беларускі дзяржаўны цырк. «Акрамя апорных сцен, у будынку цырка ўсё новае», — расказала мастацкі кіраўнік цырка, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Тацццяна Бандарчук.

Адзінае, што засталося нязменным, — кольказць глядзельных месцаў (1650) і памер манежа (дыяметрам 13 м, як ва ўсім свеце). Замест аднаго будынка ў цырку стала тры: каля асноўнага корпуса пабудаваны асобны корпус для білетных кас, а таксама рэпетыцыйны шацціпаврховы манеж. Для летніх выступленняў будаўнікі прадугледзелі адкрытую пляцоўку.

Замест аднаго манежа ў цырку будзе чатыры. Для коней і драпежнікаў — гумовы, для шоу на каньках — ледзяны, паркетны — для танцаў і пластыкавы — для іншых эфектных прадстаўленняў. Манежы схаваныя ў ніжнім ярусе, і ў залежнасці ад патрэбы адзін з іх будзе падымацца ў залу.

Для жывёл пабудавалі новы зручны ліфт, коні ў стойлах могуць не толькі адпачываць лежачы, але нават шпацыраваць, у будынку рэпетыцыйнага манежа ёсць свая ветэрынарная клініка, гардэробная для коней, схові шчы пілавіння, саломы, кухня і душ для жывёл.

**Паводле БЕЛТА**

## Нацыянальны мастацкі прапануе сустрэць Каляды у сядзібе Ваньковічаў

Супрацоўнікі музея прапануюць мінчанам прасякнуцца святочным настроем, даведацца пра калядныя традыцыі і абрады ў шляхецкай атмасферы мінскага Дома Ваньковічаў, пазнаёміцца з мастацтвам XIX стагоддзя.

Прэзентацыя праграмы «Каляды ў сядзібным доме Ваньковічаў» адбылася летась. Сёлета ў сувязі з вялікай папулярнасцю было прынята рашэнне аднавіць яе. Праграма адрасаваная сямейнай аўдыторыі і праводзіцца толькі ў снежні і студзені. Гэта добрая нагода сабрацца сям'ёй, а таксама запрасіць блізкіх і дарагіх людзей. Гасцей чакаюць сюрпрызы.

**Паводле «Мінск-Навіны»**

## Сапраўдная беларуская кухня

### Суп посны з гароднінай

3 морквы, 1 пятрушка, 1 парэй, 1—2 цыбулі, 1 шклянка белай фасолі, 0,5 капусты, 3—4 сухіх баравікоў, 0,75 л бульбы, 0,5 бручкі, соль у меры.

Прыгатаваць адвар з карэння і сухіх баравікоў у падсоленай вадзе, працадзіць, укласці пакрышаную бульбу і белую фасолю, пакрышаную моркву, бручку, белакачанную або савойскую капусту, парэзаную на некалькі частак. Тую гародніну, якая мусіць гатавацца даўжэй, класці спачатку, а тую, якая хутка варыцца, — пры канцы. Калі ўсё будзе гатова — падаваць да стала.

**З кнігі В. Завадзскай «Літоўская кухарка»**

## Прыватныя абвесткі

**ДАПАМОГА**

**Патрабуецца дапамога ў даглядзе інваліда** (жанчыны) у Гродне. Т.: (029) 582-51-34.

**Патрабуецца дапамога ў даглядзе сталай жанчыны** ў Смалявічах. (029) 111-45-97.

**ПРАЦА**

**Падпрацоўка для студэнтаў або жанчыны пенсійнага ўзросту,** якая цікавіцца беларускай літаратурай, музыкай (праца з 15-й да 19-й па буднях). Т.: (029) 615-47-76, (017) 279-47-76.

**Патрэбны пераклад (з расійскай мовы на беларускую)** файлаў для некамерцыйнага сайта www.gco.of.by. Тарашкевіца. Таксама на мову эсперанта. Прафесіянальна танна. Кантакт: ICQ: 356261040 альбо адміну сайта.

**КНІГІ**

**Прадам збор твораў Вальтэра Скота** ў васьмі тамах. Танна. Т.: (01645) 30-002.

**Кнігу У. Арлова «Імёны свабоды» прадам.** Т.: (029) 332-69-56. Святлана.

**Прадаю тлумачальны слоўнік рускай мовы Уладзіміра Даля** ў 4 тамах (100 тыс.). Т.: (017) 774-56-67. Антон.

**Мікола Ермаловіч «Выбранае», Васіль Зуёнак «Выбраныя творы»** — чарговыя кнігі праекта «Беларускі Кнігазбор» — ужо ў продажы.

**Выйшла кніга «страдацельных» песень «Жорсткі раманс»** (недаследаваны жанр у беларускай фалькларыстыцы). 435 старонак. Жадаючым набыць: (029) 672-03-75.

**Шукаю дыскі з песнямі «Янка Купала»,** «Даставай, Язэп, гармонік», а таксама кнігі М. Ткачова, 1-ую частку «Замкі Беларусі». Т.: (029) 667-39-06. Андрусь.

**ВОПРАТКА**

**Дапамагу ў стварэнні** паўсядзённай і святочнай вопраткі. Наталля. Т.: (029) 353-73-06.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Кемікі



1) У гаспадара дзве клеткі з трусамі. Калі гаспадар з меншай клеткі забярэ аднаго труса і пасадзіць у большую, то іх у большай клетцы стане ў два разы больш, чым у меншай. А калі ж з большай клеткі перасадзіць аднаго труса ў меншую, то іх у клетках стане пароўну. Колькі трусоў у кожнай клетцы?

2) Ляжыць 10 камянёў на адной лініі на адлегласці 1 м адзін ад аднаго. Яны цяжкія, несці можна толькі па адным. Якую адлегласць давядзецца прайсці, каб знесці іх у адну кучу?

**Сабрала Валянціна Карнялюк.**

**Адказы глядзі на старонцы 16.**




**БАТЭ прайграла кіеўскаму «Дынама» 1:4 у 15-градусны мароз. Матч для барысаўцаў не быў вырашальны, яны выканалі задачу выхаду ў наступны круг раней.**




**Жонка Сяргея Сідорскага Людміла (на фота злева) узяла ўдзел у дабрачыннай акцыі «Чырвоная сукенка». Акцыя прайшла ў мінскім рэстаране Piaffer. Падчас яе вядомыя асобы па ўсім свеце дэманструюць чырвоныя сукенкі, каб прыцягнуць увагу жанчын да захворванняў сардэчна-сасудзістай сістэмы.**



**Дзякуючы спадарожнікавым фатаграфіям паверхні зямлі GoogleMaps стала вядома, што на даху аэрапорта Тэгерана ёсць ізраільскі сімвал — зорка Давыда. Між тым, «міжнародны сіянізм» — галоўны вораг Махмуда Ахмадзінежада. Аказваецца, аэрапорт будавалі яшчэ да Ісламскай рэвалюцыі 1979 года ізраільскія інжынеры. Магчыма, яны дазволілі сабе невялікі жарт.**

**Выйшаў новы каляндар Pirelli 2011: багіні з Апалонамі. Галоўнай тэмай стала антычная міфалогія. Каляндар Pirelli з'яўляецца адным з сімвалаў раскошы. Распаўсюджваецца галоўным чынам сярод эксклюзіўных кліентаў кампаніі Pirelli — аднаго з самых буйных вытворцаў аўтамабільных пакрышак. Набыць каляндар немагчыма.**





**У Беларусь на зімоўку прыляцелі гілі. Напаўняем кармушкі!**

## Анекдоты

***

Гутараць Пуцін і Мядзведзеў:

— У Беларусі выбары. Лукашэнка зноў прыпаўзе грошай прасіць... Што рабіць?

— Дык скажы яму, што ўсе грошы аддалі Някляеву і Саннікаву.

***

Адзін кандыдат абяцае дапамогу па нараджэнні дзіцяці. Другі — траціну месцаў у дзяржструктурах жанчынам. Трэці — паявлічыць выдаткі на войска і міліцыю. Някляеў, Раманчук, Міхалевіч: разам мы — Лукашэнка!

***

Мужчына заходзіць у краму адзення і просіць прадаўца:

— Не маглі б вы зняць з вітрыны той жоўты пінжак?

— Вядома! Адну хвіліну...

— Дзякуй, — кажа мужчына, выходзячы з крамы. — Сілаў маіх больш няма глядзець на гэты жах.

***

Калі верыць паказанням спідометра, «Лада-Каліна» стаіць у гаражы з хуткасцю 20 км/г.

***

— Ты ведаеш, я разводжуся з жонкай. Яна ўжо паўгода са мной не размаўляе.

— Ну ты надумаўся! Дзе ты яшчэ знойдзеш такую жонку?!

***

Парадокс: людзі выходзяць на свежае паветра, каб пакурыць.

## «НН» сто гадоў з вамі

**Мінск.** Тутэйшы аддзел «Саюза рускага народа» зусім рассыпаецца. Саюзнікі, праўда, робяць сходы ў манастырскай зале кожны тыдзень, але на гэтых сходах вельмі пуста.

**«НН». №46. 1910.**

**Апазіцыянеры сустрэліся з Саланам.** Лідары аб'яднанай беларускай апазіцыі сустрэліся з генеральным сакратаром Еўрасаюза Хаўерам Саланам. Вінцук Вячорка, Анатоль Лябедзька, Аляксей Кароль і Андрэй Саннікаў наведалі Брусэль і абмеркавалі з Саланам перспектывы дэмакратычнага развіцця Беларусі. Напярэдадні яны рабілі даклад у Страсбургу ў Еўрапарламенце.

**«НН». №48. 2000.**

**Адказы да старонкі 15:**

1) Вася Сіліч і Пеця Новік; 2) У кожнай каробцы ляжыць 50 гузікаў.

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6436.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 07.12.2010.
Замова № 5959.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614
9 771819 161008 10046